WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

25 МАЯ 2011 г. СЕРАДА № 95 (26959)

Кошт 750 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

Фота БЕЛТА.



# ПРЭЗІДЭНТЫ БЕЛАРУСІ І КАЗАХСТАНА ВЫКАЗАЛІ ЗАДАВАЛЬНЕННЕ ВЫНІКАМІ АФІЦЫЙНАГА ВІЗІТУ АЛЯКСАНДРА ЛУКАШЭНКІ

**Аб гэтым гаворыцца ў сумеснай заяве кіраўнікоў дзяржаў, якую яны падпісалі па выніках перагавораў у Астане, передае карэспандэнт БЕЛТА.**

У сумеснай заяве падкрэслена, што візіт прайшоў у атмасферы дружбы, узаемаразумення і даверу. «Блізкасць пазіцый па актуальных пытаннях двухбаковага і міжнароднага парадкаў дня, а таксама дасягнутыя дамоўленасці падкрэсліваюць паступальнае развіццё стратэгічнага беларуска-казахстанскага партнёрства», — гаворыцца ў дакуменце.

Аляксандр Лукашэнка, падзякаваўшы за цёплы прыём і гасціннасць, аказаныя яму і беларускай дэлегацыі, запрасіў Прэзідэнта Казахстана Нурсултана Назарбаева наведаць з афіцыйным візітам Беларусь у зручны для яго час.

Акрамя таго, у Астане падпісаны пагадненне аб супрацоўніцтве паміж міністэрствамі ўнутраных спраў Беларусі і Казахстана, пагадненне паміж міністэрствамі абароны аб супрацоўніцтве ў галіне бяспекі палётаў дзяржаўных паветраных суднаў, міжурадавае пагадненне аб супрацоўніцтве ў галіне ўрадавай сувязі. Подпісы пад гэтымі дакументамі з беларускага боку паставіў міністр замежных спраў Сяргей Мартынаў.

Прэзідэнт Казахстана адзначыў значнае павелічэнне тавараабароту паміж дзвюма краінамі, асабліва за апошнія два гады. Паспяхова ідзе зборка тэхнікі на сумесных прадпрыемствах. «Гэта сведчыць аб тым, што мы на правільным шляху, і ваш візіт надасць яшчэ большы імпульс супрацоўніцтву. Будзем дамаўляцца аб новых праектах», — адзначыў казахстанскі лідар.

У сваю чаргу Аляксандр Лукашэнка сказаў: «Я не мог не прыехаць да чалавека, які заўсёды падтрымліваў і падтрымлівае беларускі народ. У тыя снежаньскія дні вы былі першым, хто павіншаваў нас з вынікамі прэзідэнцкай кампаніі, хто працягнуў руку беларускаму народу».

Прэзідэнт Беларусі таксама павіншаваў Нурсултана Назарбаева з пераканаўчай перамогай на прэзідэнцкіх выбарах, якія нядаўна прайшлі ў рэспубліцы. «Казахстанскі народ выбраў чалавека, на якога мы разлічваем з пункту гледжання захавання пераемнасці адносін з Беларуссю», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

«Мы намецілі шэраг праграм, каля 30, у 2009 годзе. Настаў час паглядзець гэтыя праграмы, калі неабходна — прарэвізаваць, дабавіць новыя», — сказаў кіраўнік беларускай дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што Адзіная эканамічная прастора — гэта вялікія магчымасці для Беларусі, Казахстана і Расіі, аднак разам з тым гэта і абавязацельствы. «Мы вельмі разлічваем, што ў Адзінай эканамічнай прасторы не будзе штучных перашкод, якія сёння існуюць, для пастаўкі нафты і нафтапрадуктаў у Беларусь і далейшай перапрацоўкі, як і іншых тавараў», — заявіў Прэзідэнт Беларусі.

Як адзначыў Аляксандр Лукашэнка, беларускі і казахстанскі народы не адно дзесяцігоддзе аб'ядноўваюць не толькі цеснае супрацоўніцтва і ўзаемадапамога, але і ўнікальныя саюзніцкія адносіны.

СТАР. 2

# Мінэканомікі абяцае зрабіць пераразлік працоўных пенсій і кампенсаваць зарплату

**Сваімі думкамі наконт асаблівасцяў развіцця нашай эканомікі ва ўмовах істотнага змянення афіцыйнага курсу беларускага рубля і наконт эканамічнай сітуацыі ў краіне з журналістамі падзяліўся Андрэй ТУР, намеснік міністра эканомікі:**

— 23 мая Нацбанк прыняў рашэнне аб фактычнай дэвальвацыі беларускага рубля на 56%. З-за гэтага адбываецца цэлы шэраг няпростых змен, якія могуць рэзка паўплываць у цэлым на сітуацыю сацыяльна-эканамічнага плана і развіцця, — сказаў Андрэй Тур.

Перш за ўсё ён выказаў перакананне, што ажыятажны попыт на некаторыя віды тавараў, які зараз склаўся па краіне, абсалютна безгрунтоўны:

— Я магу вас заспакоіць: інфляцыйныя чаканні і проста фенаменальна павышаны попыт на некаторыя віды прадукцыі, кажу цалкам шчыра, абсалютна безгрунтоўныя — тавараў, на якія існуе павышаны попыт, хапае, іх запасы ў аптовай сетцы перавышаюць месячную норму. І той ажыятажны попыт, які існуе, шмат у чым выкліканы пэўнымі спекуляцыямі. Бо пры існаванні такога вялікага дыспарытэту цэн узнікае цэлы шэраг спекулятыўных шчылін, якія дазваляюць, гуляючы на розніцы валютных курсаў і цэн, наладжваць спецыфічны бізнэс, які прыводзіць да абвастрэння сацыяльных пытанняў і пытанняў, звязаных са спажывецкім рынкам, — сказаў Андрэй Мікалаевіч і дадаў, што, па словах прадстаўнікоў гандлю, ні аптовая сетка, ні сам гандаль аказаліся не гатовыя да такога ажыятажнага попыту.

Ён падкрэсліў, што ўрад зараз выпрацоўвае пакет мер па ліквідацыі дыспарытэту цэн, а таксама паведаміў, што будзе пашырацца сфера выкарыстання замежнай валюты пры разліках на тэрыторыі РБ — аплата паліва, паслуг гасцініц, прыдарожнага сэрвісу, турыстычных паслуг, мытных пошлін і г.д. Гэта павінна прывесці да карэкціроўкі не толькі стану валютнага рынку, але і ў цэлым той адноснай разбалансаванасці, якая сёння існуе, сказаў Андрэй Мікалаевіч.

Шмат у чым, лічыць намеснік міністра эканомікі, і самі грамадзяне ствараюць сабе праблемы з таварамі:

— Учора я бачыў бабульку, якая цягнула ў двух руках па 5 ці 7 кілаграмаў солі ў кожнай руцэ і аж хісталася.... Напрыклад, мне на сям'ю патрабуецца 2 кілаграмы солі за год. І я не ведаю, наколькі ёй хопіць гэтай солі. Такім чынам мы самі ствараем праблемы, на якія самі потым і крыўдзімся.

Андрэй Тур таксама заявіў, што зараз не плануецца ўводзіць некія дзяржаўныя манаполіі на спажывецкі імпарт:

— На спажывецкім рынку, і такое рашэнне прынятае, ніякіх абмежаванняў з пункту гледжання насычанасці асартыменту не павінна быць, — сказаў ён і дадаў, што для барацьбы са спекуляцыйнымі з'явамі будуць задзейнічаныя антыманапольныя рычагі. — У нас застаецца літаральна 14 рэгулюемых пазіцый на сацыяльна значныя тавары. А па іншых групах хутчэй за ўсё будзе ўзмоцнены маніторынг на месцах па цэнах з пункту гледжання антыманапольнага заканадаўства. Якраз на меры антыманапольнага рэгулявання на рынку будзе звернута самая сур'ёзная ўвага. У першую чаргу я маю на ўвазе пытанні, звязаныя са змовай аптовых пастаўшчыкоў, са спекулятыўнымі цэнамі на цэлы шэраг тавараў. Таксама мы адзначаем, што шмат якія суб'екты гаспадарання, пастаянна адчуваючы нагнятанне цэнавага інфляцыйнага ўсплёску, некаторыя віды тавараў не пастаўляюць у розніцу... Гэта можа падацца парадаксальным, але я мяркую, што курс на рэалізацыю палажэнняў Дырэктывы №4 у гэтых умовах павінен быць узмоцнены. Бо толькі ва ўмовах наяўнасці добрасумленнай канкурэнцыі шмат якія пытанні, звязаныя з насычэннем спажывецкага рынку, і цэнамі на ім, могуць вырашацца. Але менавіта толькі пры добрасумленнай канкурэнцыі, — падкрэсліў ён.

Што тычыцца сацыяльнай абароны насельніцтва, то намеснік міністра эканомікі перакананы, што дзяржава павінна кампенсаваць насельніцтву страты ад дэвальвацыі:

— Па мерах сацыяльнай абароны ўжо ў бліжэйшы час будзе прынятае рашэнне па павышэнні і пераразліку працоўных пенсій з 1 чэрвеня, будзе таксама кампенсацыя заработнай платы для ўсіх катэгорый працаўнікоў бюджэтнай сферы. А як вы самі разумееце, калі гаворка ідзе не аб змяненні тарыфнай стаўкі 1 разраду, а пра кампенсацыю, то гэта азначае, што ўсе атрымаюць роўна — і высокааплачваемы і нізкааплачваемы атрымаюць аднолькавы кампенсацыйны складнік. Акрамя таго, гаворка ідзе пра тое, каб у бліжэйшы час стварыць максімум умоў для падтрымкі ў больш-менш нармальным стане самых слабых сацыяльных слаёў — я кажу пра ўзмацненне адраснай сацыяльнай дапамогі для маламаёмных. Па прыкладных разліках толькі для сацыяльнай дапамогі будзе патрэбна больш за 230-250 мільярдаў рублёў.

СТАР. 2

ISSN 1990 - 763X



белагропромбанк
традиции будущего

ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО «Белагропромбанк»

220036, Республика Беларусь, г. Минск, пр-т Жукова, 3

## КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ БАЛАНС на 1 января 2011 года

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт пояснительной записки | 2010 г. | 2009 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 5.1.1 | 364 898,8 | 282 248,6 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | 5.1.2 | 2 641,7 | 2 465,6 |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 5.1.3 | 2 569 961,1 | 109 600,5 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 5.1.4 | 345 453,8 | 83 554,7 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 5.1.5 | 1 461 456,8 | 472 872,0 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 5.1.6 | 24 187 615,0 | 17 844 235,8 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | 5.1.7 | 9 035,3 | 15 245,5 |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | 5.1.8 | 175 908,3 | 50 808,2 |
| 10 | Инвестиции в зависимые юридические лица | | 5.1.9 | 2013,0 | - |
| 11 | Инвестиции в совместно контролируемые юридические лица | | | - | - |
| 12 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 5.1.10 | 1 094 669,5 | 720 335,4 |
| 13 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | 5.1.11 | 2 130,1 | 2 149,4 |
| 14 | Деловая репутация | | | - | - |
| 15 | Прочие активы | 1111 | 5.1.12 | 297 172,4 | 193 430,4 |
| **16** | **ИТОГО активы** | **11** | | **30 512 955,8** | **19 776 946,1** |
| 17 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | | |
| 18 | Средства Национального банка | 1201 | 5.1.13 | 5 594 743,6 | 2 554 477,1 |
| 19 | Средства банков | 1202 | 5.1.14 | 4 187 972,7 | 3 658 447,0 |
| 20 | Средства клиентов | 1203 | 5.1.15 | 11 844 833,4 | 8 547 662,4 |
| 21 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | 5.1.16 | 2 496 766,7 | 194 308,4 |
| 22 | Производные финансовые обязательства | 1205 | 5.1.17 | 4,5 | 33,9 |
| 23 | Прочие обязательства | 1206 | 5.1.18 | 196 851,3 | 217 020,5 |
| **24** | **ВСЕГО обязательства** | **120** | | **24 321 172,2** | **15 171 949,3** |
| 25 | **КАПИТАЛ** | | | | |
| 26 | Уставный фонд | 1211 | 5.1.19 | 5 003 591,0 | 3 878 600,0 |
| 27 | Эмиссионный доход | 1212 | | - | - |
| 28 | Резервный фонд | 1213 | 5.1.20 | 200 273,8 | 85 504,8 |
| 29 | Фонд переоценки статей баланса | 1214 | 5.1.21 | 352 430,6 | 248 313,9 |
| 30 | Накопленная прибыль | 1215 | 5.1.22 | 623 277,5 | 391 268,3 |
| 31 | Всего капитал, принадлежащий головной организации – банку | | | 6 179 572,9 | 4 603 687,0 |
| 32 | Доля неконтролирующих акционеров | | 5.1.23 | 12 210,7 | 1 309,8 |
| **33** | **ВСЕГО капитал** | **121** | | **6 191 783,6** | **4 604 996,8** |
| **34** | **ИТОГО обязательства и капитал** | **12** | | **30 512 955,8** | **19 776 946,1** |

## КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ за 2010 год

(в миллионах белорусских рублей)

| № п.п. | Наименование статьи | Символ | Пункт пояснительной записки | 2010 г. | 2009 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 5.2.1 | 2 651 172,6 | 2 120 655,7 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 5.2.1 | 1 516 774,9 | 1 431 672,5 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 5.2.1 | 1 134 397,7 | 688 983,2 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 5.2.2 | 298 216,7 | 234 797,1 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 5.2.2 | 57 501,6 | 36 550,6 |
| 6 | Чистые комисионные доходы | 202 | 5.2.2 | 240 715,1 | 198 246,5 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | 5.2.3 | 812,1 | 623,7 |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | 5.2.4 | (6 686,3) | (378,8) |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 5.2.5 | 140 085,3 | (96 278,6) |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | 5.2.6 | (41 919,1) | 164 285,7 |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 5.2.7 | 845 828,7 | 363 528,9 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 5.2.8 | 300 242,3 | 251 189,0 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 5.2.9 | 558 715,8 | 552 695,8 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 5.2.10 | 52 176,8 | 61 734,6 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | 5.2.11 | 310 925,8 | 228 711,4 |
| 16 | Налог на прибыль | 212 | 5.2.12 | 11 981,1 | 81 510,8 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | | 298 944,7 | 147 200,6 |
| 18 | Доля в прибыли (убытке) зависимых юридических лиц | | | 13,0 | - |
| 19 | Доля в прибыли (убытке) совместно контролируемых юридических лиц | | | - | - |
| 20 | ИТОГО ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | | | 298 957,7 | 147 200,6 |
| 21 | Доля в прибыли (убытке), принадлежащая головной организации – банку | | | 298 107,1 | 146 730,5 |
| 22 | Доля неконтролирующих акционеров в прибыли (убытке) | | | 850,6 | 470,1 |
| 23 | Базовая прибыль на простую акцию (в рублях) | | 5.2.13 | 148,57 | 76,64 |
| 24 | Разводненная прибыль на простую акцию | | 5.2.14 | - | - |

## КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ ОТЧЕТ ОБ ИЗМЕНЕНИИ КАПИТАЛА за 2010 год

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование показателей | Символ | Наименование статей капитала: Уставный фонд | Эмиссионный доход | Резервный фонд | Накопленная прибыль (убыток) | Фонды переоценки статей баланса | Всего капитал, принадлежащий головной организации-банка | Доля неконтролирующих акционеров | Всего капитал |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 |
| | **Раздел 1. За год, предшествующий отчетному** | | | | | | | | | |
| 1 | Остаток на 1 января 2009 г. | 3011 | 3828598,5 | - | 41862,5 | 291428,2 | 232500,1 | 4394389,3 | 568,9 | 4394958,2 |
| 2 | Изменения статей капитала, в том числе: | 3012 | 50001,5 | - | 43642,3 | 99840,1 | 15813,8 | 209297,7 | 740,9 | 210038,6 |
| 2.1 | совокупный доход | 30121 | x | x | x | 146730,5 | 15813,8 | 162544,3 | 486,1 | 163030,4 |
| 2.2 | направление прибыли на пополнение фондов | 30122 | - | x | 43642,3 | (43642,3) | x | - | x | - |
| 2.3 | операции с учредителями (участниками): | 30123 | 50001,5 | - | x | (1766,8) | x | 48234,7 | x | 48234,7 |
| 2.4 | внесение в уставный фонд вкладов учредителей (участников) | 301231 | 50000,0 | - | x | x | x | 50000,0 | x | 50000,0 |
| 2.5 | выплата дивидендов акционерам | 301232 | x | x | x | (1766,8) | x | (1766,8) | x | (1766,8) |
| 2.6 | операции с собственными выкупленными акциями | 301233 | 1,5 | x | x | x | x | 1,5 | x | 1,5 |
| 2.7 | перераспределение между статьями капитала | 30125 | - | - | - | - | - | - | x | - |
| 2.8 | прочие изменения | 30126 | - | - | - | (1481,3) | - | (1481,3) | 234,8 | (1246,5) |
| | Приобретение дочернего юридического лица | | x | x | x | x | x | x | 20,0 | 20,0 |
| 3 | Остаток на 1 января 2010 г. | 3013 | 3878600,0 | - | 85504,8 | 391268,3 | 248313,9 | 4603687,0 | 1309,8 | 4604996,8 |
| | **Раздел II. За отчетный год** | | | | | | | | | |
| 4 | Остаток на 1 января 2010 г. | 3011 | 3878600,0 | - | 85504,8 | 391268,3 | 248313,9 | 4603687,0 | 1309,8 | 4604996,8 |
| 5 | Изменения статей капитала, в том числе: | 3012 | 1124991,0 | - | 114769,0 | 232009,2 | 104116,7 | 1575885,9 | 10900,9 | 1586786,8 |
| 5.1 | совокупный доход | 30121 | x | x | x | 298107,1 | 104119,7 | 402226,8 | 1952,4 | 404179,2 |
| 5.2 | направление прибыли на пополнение фондов | 30122 | - | x | 114689,8 | (114689,8) | x | - | x | - |
| 5.3 | операции с учредителями (участниками): | 30123 | 1125000,0 | - | x | (2356,6) | x | 1122643,4 | x | 1122643,4 |
| 5.4 | внесение в уставный фонд вкладов учредителей (участников) | 301231 | 1125000,0 | - | x | x | x | 1125000,0 | x | 1125000,0 |
| 5.5 | выплата дивидендов акционерам | 301232 | x | x | x | (2356,6) | x | (2356,6) | x | (2356,6) |
| 5.6 | операции с собственными выкупленными акциями | 301233 | - | x | x | x | x | - | x | - |
| 5.7 | перераспределение между статьями капитала | 30125 | - | - | - | - | - | - | x | - |
| 5.8 | прочие изменения | 30126 | (9,0) | - | 79,2 | 50948,5 | (3,0) | 51015,7 | 8948,5 | 59964,2 |
| 6 | Остаток на 1 января 2011 г. | 3013 | 5003591,0 | - | 200273,8 | 623277,5 | 352430,6 | 6179572,9 | 12210,7 | 6191783,6 |

## КОНСОЛИДИРОВАННЫЕ СВЕДЕНИЯ О СОВОКУПНОМ ДОХОДЕ за 2010 год

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт пояснительной записки | 2010 г. | 2009 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Прибыль за отчетный период | 301211 | | 298957,7 | 147200,6 |
| 2 | Прочие компоненты совокупного дохода за отчетный период, в том числе: | 301212 | | 105221,5 | 15829,8 |
| 2.1 | переоценка основных средств | 3012121 | | 101137,4 | 15246,7 |
| 2.2 | переоценка незавершенного строительства и неустановленного оборудования | 3012122 | | 3990,1 | 583,1 |
| 2.3 | переоценка ценных бумаг | 3012123 | | 94,0 | - |
| 2.4 | переоценка инструментов хеджирования | 3012124 | | - | - |
| 2.5 | переоценка прочих статей баланса | 3012125 | | - | - |
| 3 | ИТОГО совокупный доход за отчетный период | 30121 | 5.3.1 | 404179,2 | 163030,4 |
| | Доля в совокупном доходе, принадлежащая головной организации-банка | | | 402226,8 | 162544,3 |
| | Доля неконтролирующих акционеров в совокупном доходе | | | 1952,4 | 486,1 |

## КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ ОТЧЕТ О ДВИЖЕНИИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ за 2010 год

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт пояснительной записки | 2010 год | 2009 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | **ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ОПЕРАЦИОННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ** | | | | |
| 2 | Полученные процентные доходы | 70100 | | 2 468 302,8 | 2 131 686,8 |
| 3 | Уплаченные процентные расходы | 70101 | | (1 471 545,2) | (1 439 365,8) |
| 4 | Полученные комиссионные доходы | 70102 | | 296 758,9 | 232 787,5 |
| 5 | Уплаченные комиссионные расходы | 70103 | | (55 784,7) | (34 191,5) |
| 6 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 70104 | | 812,1 | 623,7 |
| 7 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 70105 | | (6 684,3) | (378,8) |
| 8 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 70106 | | 136 919,1 | 82 188,6 |
| 9 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 70107 | | (43 690,0) | 164 285,7 |
| 10 | Прочие полученные доходы | 70108 | | 303 831,6 | 142 863,6 |
| 11 | Прочие уплаченные расходы | 70109 | | (486 565,1) | (424 071,7) |
| 12 | Уплаченный налог на прибыль | 70110 | | (12 763,8) | (87 175,4) |
| 13 | Денежная прибыль (убыток) до изменения в операционных активах и операционных обязательствах, итого | 701 | | 1 129 591,4 | 769 252,7 |
| 14 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в Национальном банке | 70200 | | (1 655 362,9) | 69 919,8 |
| 15 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в банках | 70201 | | 20 459,3 | 45 018,3 |
| 16 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в ценных бумагах (кроме ценных бумаг, удерживаемых до погашения) | 70202 | | (1 021 115,7) | 908 486,6 |
| 17 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в форме кредитов, выданных клиентам | 70203 | | (7 208 711,3) | (4 956 163,1) |
| 18 | Чистое снижение (прирост) денежных средств от производных финансовых активов | 70204 | | 7 985,6 | (14 413,1) |
| 19 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в прочих операционных активах | 70205 | | (50 223,5) | 56 442,5 |
| 20 | Потоки денежных средств от изменения операционных активов, итого | 702 | | (9 906 968,5) | (3 890 709,0) |
| 21 | Чистый прирост (снижение) денежных средств Национального банка | 70300 | | 3 033 102,0 | 1 541 731,9 |
| 22 | Чистый прирост (снижение) денежных средств банков | 70301 | | 552 404,3 | 1 512 531,9 |
| 23 | Чистый прирост (снижение) денежных средств клиентов | 70302 | | 3 265 216,5 | 247 693,6 |
| 24 | Чистый прирост (снижение) денежных средств от ценных бумаг, выпущенных банком | 70303 | | 2 274 251,0 | (16 955,8) |
| 25 | Чистый прирост (снижение) денежных средств от производных финансовых обязательств | 70304 | | (33,9) | (7 771,7) |
| 26 | Чистый прирост (снижение) денежных средств в прочих операционных обязательствах | 70305 | | 19 986,8 | (52 746,1) |
| 27 | Потоки денежных средств от изменения операционных обязательств, итого | 703 | | 9 144 926,7 | 3 224 483,8 |
| 28 | Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от операционной деятельности | 70 | | 367 549,6 | 103 027,5 |
| 29 | **ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ИНВЕСТИЦИОННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ** | | | | |
| 30 | Приобретение основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 71100 | | (203 083,5) | (226 616,7) |
| 31 | Продажа основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 71101 | | 7 753,9 | (4 851,6) |
| 32 | Приобретение долгосрочных финансовых вложений в уставные фонды других юридических лиц | 71102 | | (125 000,0) | (58 692,6) |
| 33 | Продажа долгосрочных финансовых вложений в уставные фонды других юридических лиц | 71103 | | - | - |
| 34 | Приобретение ценных бумаг, удерживаемых до погашения | 71104 | | - | (41,8) |
| 35 | Погашение (реализация ) ценных бумаг, удерживаемых до погашения | 71105 | | 2,0 | 32,2 |
| 36 | Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от инвестиционной деятельности | 71 | | (320 327,6) | (290 170,5) |
| 37 | **ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ФИНАНСОВОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ** | | | | |
| 38 | Эмиссия акций | 72100 | | 1 125 000,0 | 50 320,0 |
| 39 | Выкуп собственных акций | 72101 | | - | - |
| 40 | Продажа ранее выкупленных собственных акций | 72102 | | - | 1,5 |
| 41 | Выплата дивидендов | 72103 | | (8 586,4) | (1 822,1) |
| 42 | Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от финансовой деятельности | 72 | | 1 116 413,6 | 48 499,4 |
| 43 | Влияние изменений валютного курса на денежные средства и их эквиваленты | 73 | | 5 150,4 | 55 332,4 |
| 44 | Чистый прирост (снижение) денежных средств и их эквивалентов | 74 | 5.4.1 | 1 168 786,0 | (83 311,2) |
| 45 | Денежные средства и их эквиваленты на начало отчетного периода | 740 | | X | 317 076,0 |
| 46 | Денежные средства и их эквиваленты на конец отчетного периода | 741 | 5.4.2 | 1 485 862,0 | X |

**Председатель Правления** **В.И. Подковыров**

**Главный бухгалтер** **М.А. Шаповалова**

**Дата подписания «6» мая 2011 г.**

## ПЕРЕЧЕНЬ УЧАСТНИКОВ БАНКОВСКОГО ХОЛДИНГА:

- ОАО «Белагропромбанк» – головная организация банковского холдинга, место нахождения: г. Минск, пр-т Жукова, 3;
- ЧУП «Озерицкий-Агро», место нахождения: Минская область, Смолевичский район, д. Слобода, ул. Центральная, 7;
- ОАО «Агролизинг», место нахождения: г. Минск, ул. Ольшевского, 24, офис 907;
- Частное предприятие «Агробизнесконсалт», место нахождения: г. Минск, ул. Мележа, 1, офис 1023;
- ОАО «Туровщина», место нахождения: Гомельская область, Житковичский район, д. Озераны, ул. Молодежная, 1;
- ОАО «Туровский молочный комбинат», место нахождения: Гомельская область, Житковичский район, г. Туров, ул. Ленинская, 152.

Лицензия на осуществление банковской деятельности от 22.07.2009 № 2, выдана Национальным банком Республики Беларусь.

KPMG

**ООО «КПМГ»**
ул. Димитрова, 5
Помещение 9
220004, Минск, Беларусь

Телефон +375 (17) 306 08 03
Факс +375 (17) 306 08 12
Моб. + 375 29 104 75 15
Интернет www.kpmg.by

Акционерам ОАО «Белагропромбанк»
пр. Жукова, 3
г. Минск
Республика Беларусь
220036
ОАО «Белагропромбанк» зарегистрировано
в Национальном банке Республики Беларусь 03.09.1991,
регистрационный номер 20.

Исх. номер 1005-04

**Аудиторское заключение по консолидированной финансовой отчетности банковского холдинга ОАО «Белагропромбанк» за 2010 год**

Мы провели аудит прилагаемой консолидированной финансовой отчетности Открытого акционерного общества «Белагропромбанк» (далее – «Банк») и его дочерних компаний (далее – «Банковский холдинг»), состоящей из консолидированного баланса на 1 января 2011 года, консолидированного отчета о прибыли и убытках, консолидированного отчета об изменении капитала и консолидированного отчета о движении денежных средств за 2010 год, а также пояснительной записки.

Сравнительная информация в консолидированной финансовой отчетности подготовлена на основании данных консолидированной финансовой отчетности Банка за 2009 год, которая была проверена другой аудиторской организацией, аудиторское заключение которой датировано 7 мая 2010 года и содержит безусловно положительное мнение о консолидированной финансовой отчетности Банковского холдинга за этот период.

*Ответственность руководства относительно консолидированной финансовой отчетности*

Руководство Банка несет ответственность за подготовку и объективное представление консолидированной финансовой отчетности в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь, а также за систему внутреннего контроля, которая, по его мнению, является необходимой для подготовки консолидированной финансовой отчетности, не содержащей существенных искажений, вызванных мошенничеством либо ошибкой.

*Ответственность аудиторов*

В наши обязанности входит выражение мнения о консолидированной финансовой отчетности на основе проведенного нами аудита.

Мы провели аудит в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь и Международными стандартами аудита, если они не противоречат названным требованиям. Эти стандарты и требования обязывают нас соответствовать этическим требованиям и планировать и проводить аудит таким образом, чтобы обеспечить разумную уверенность в том, что консолидированная финансовая отчетность не содержит существенных искажений.

Аудит включает в себя проведение процедур для получения аудиторских доказательств по суммам и раскрытиям, представленным в консолидированной финансовой отчетности. Отбор процедур проводится на основании суждений аудитора, включающих оценку риска наличия существенных искажений в консолидированной финансовой отчетности, вне зависимости от того, явилось ли их причиной мошенничество или ошибка. При оценке данного риска аудитор рассматривает работу системы внутреннего контроля, относящуюся к подготовке и объективному представлению консолидированной финансовой отчетности Банкковского холдинга, в целях разработки соответствующих аудиторских процедур, но не в целях выражения мнения об эффективности работы самой системы внутреннего контроля Банковского холдинга. Аудит также включает в себя оценку приемлемости используемой учетной политики, обоснованности оценочных значений, сделанных руководством Банка, и оценку общего представления консолидированной финансовой отчетности.

Мы полагаем, что полученные нами аудиторские доказательства обеспечивают достаточные и надлежащие основания для выражения нашего аудиторского мнения.

*Аудиторское мнение*

По нашему мнению, консолидированная финансовая отчетность достоверно отражает во всех существенных отношениях финансовое положение Открытого акционерного общества «Белагропромбанк» и его дочерних компаний на 1 января 2011 года, а также результаты деятельности и движение денежных средств за 2010 год, в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь, касающимися подготовки консолидированной финансовой отчетности.

**Верещагина Ирина Владимировна**
Директор

**Абойшева Анна Михайловна**
Руководитель аудиторской группы

10 мая 2011 года

г. Минск, Республика Беларусь

Общество с ограниченной ответственностью «КПМГ»

Свидетельство о государственной регистрации выдано Минским горисполкомом на основании решения от 10.02.2011, УНП 191434140

КПМГ, общество с ограниченной ответственностью и фирма-член сети независимых фирм КПМГ, входящих в состав КПМГ Интернейшнл Кооператив («КПМГ Интернейшнл»), ассоциации, созданной по законодательству Швейцарии.

УНП № 191434140
Юридический адрес:
г. Минск, ул. Димитрова, 5
Помещение 9
220004 Минск Беларусь

# Мінэканомікі абяцае зрабіць пераразлік працоўных пенсій і кампенсаваць зарплату

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Плануецца, што рэальныя ўмовы для жыцця маламаёмных будуць па максімуму захаваныя ў тых межах, што было да апошняга часу, — сказаў ён і дадаў, што таксама будзе павышана магчымасць самазанятасці для тых катэгорый работнікаў, якія будуць адпраўлены ў неаплачваемыя водпускі або працаваць няпоўны тыдзень.

— Мы, не маючы рэсурсаў, як маюць з адкрытай эканомікай, можам нармальна, паспяхова і ўстойліва развівацца, але пры ўмове нарошчвання экспарту і прыцягнення прамых замежных інвестыцый. Гэта два стратэгічныя пункты, на якія мы павінны разлічваць, — сказаў Андрэй Тур і падкрэсліў пры гэтым важнасць жорсткай эканоміі. — Практычна ўсе краіны, якія былі закранутыя сусветным эканамічным крызісам, вядуць вельмі жорсткія і строгія бюджэтныя абмежаванні на выдаткі. Усё звodзіцца да разумення таго, што жыць трэба па сродках і расходаваць трэба тое, што ты зарабляеш, бо інакш стварaецца дысбаланс, які можа прывесці да дастаткова сур'ёзнай сітуацыі.

Пры гэтым Андрэй Мікалаевіч паведаміў, што ў бліжэйшы час адбудзецца нарада ў кіраўніка дзяржавы, дзе будзе вырашана, наколькі сур'ёзна наша краіна гатовая ўразаць дзяржпраграмы.

**Павел БЕРАСНЕЎ.**

# Ялавічына падаражэе на 10%, свініна — на 8%

У май-чэрвені павелічэнне максімальных адпускных цэн на ялавічыну патушную плануецца Мінэканомікі на 10%, а на свініну патушную — на 8%. Такія лічбы прадугледжаны Пастановай № 65 Міністэрства эканомікі ад 27 красавіка 2011 года, якая пачала дзейнічаць з сённяшняга дня. Як патлумачылі ў Мінэканомікі, такое павелічэнне максімальных адпускных цэн зроблена па прапанове Мінсельгасхарча і звязана са значным ростам закупачных цэн на буйную рагатую жывёлу і свіней.

Акрамя мяса, гэтай пастановай таксама прадугледжана захаванне рэгулявання і ўсталяванне гранічных максімальных адпускных цэн і на іншыя сацыяльна значныя прадукты харчавання — хлеб жытні і жытнепшанічны, батоны і хлябцы з пшанічнай мукі няздобныя развесам 300 грамаў і болей, малако каровіна пастэрызаванае і кефір з каровінага малака тлустасцю да 3,5% уключна, смятану тлустасцю да 25% уключна, тварог тлустасцю да 9% уключна без смакавых дабаўк і напаўняльнікаў. Як адзначаюць у Мінэканомікі, гранічныя максімальныя цэны на гэтыя віды тавараў захаваныя на цяперашнім узроўні.

Што тычыцца розничных цэн на некаторых групах малочных прадуктаў (накшталт тварагу ў герметычнай упакоўцы, тварагу зярнёнага і камбінаванага з іншымі харчовымі прадуктамі, малака і кефіру ў бутэльках з поліэтыленгэрэфталата, смятаны ў пластыкавых кубачках), то іх рэгуляванне захоўваецца праз усталяванне максімальных гандлёвых надбавак (з улікам аптовай надбаўкі), затое фарміраваць адпускныя цэны на такія тавары арганізацыі-вытворцы будуць з улікам кан'юнктуры рынку.

Фарміраваць цэны, зыходзячы з кан'юнктуры рынку, будуць і прадпрыемствы перапрацоўчай прамысловасці на асобныя пазіцыі хлебабулачных і малочных тавараў, якія маюць абмежаванае кола спажыўцоў і не нясуць сацыяльнай накіраванасці. Сюды, у прыватнасці, аднесеныя хлябы заварныя з выкарыстаннем дадатковай сыравіны замежнага паходжання, хлеб для тостаў, булачныя вырабы з начынкамі і развесам менш за 300 грамаў, асобныя віды лаваша і праснакі, дыетычныя і ўзбагачаныя хлебабулачныя вырабы, хлебабулачныя вырабы для спартсменаў, малочныя прадукты не з каровінага малака, а таксама малочныя прадукты з рознымі смакавымі дабаўкамі і напаўняльнікамі.

**Павел БЕРАСНЕЎ.**

## ДЭФІЦЫТ ЗНЕШНЯГА ГАНДЛЮ ВЫРАС І СКЛАЎ 3,75 МІЛЬЯРДА ДОЛАРАЎ

За студзень-красавік 2011 адмоўнае сальда знешняга гандлю таварамі склала 3,751 мільярда долараў, паведамляе Белстат. За аналагічны перыяд 2010 года гэты паказчык складаў 2,024 мільярды — такім чынам адмоўнае сальда павялічылася на 85,3%. Экспарт тавараў па выніках 4-х месяцаў 2011 года склаў 11,253 мільярда долараў (у 2010 годзе за аналагічны перыяд — 7,274 мільярда, рост — 54,7%), а імпарт вырас з 9,298 мільярда ў 2010 годзе да 15 мільярдаў у 2011 (рост 61,4%).

**Павел БЕРАСНЕЎ.**

Парламенцкі дзённік

# ЧУТКІ З ПРАБЕГАМ

*Пошліны на легкавушкі, насуперак апошнім пагалоскам, з першага ліпеня ўсё ж будуць павышаны*

Апроч талерантнасці, тыповай рысай нацыянальнага характару беларусаў, як паказваюць апошнія падзеі, смела можна лічыць цягу да чутак. Адсюль і схільнасць дзейнічаць у адзіным ажыятажным парыве, кіруючыся толькі цьмяным «Кажуць ...». Кажуць, «падскочыць» бензін — і на запраўцы ўжо непамерныя чэргі людзей з каністрамі. Кажуць, з наяўнымі грашыма будзе напружанасць — і грамада ўжо штурмуе банкаматы. Кажуць, што і маса хлебам мажуць...

Апошняя «свежаніна» сарафаннага радыё — «Кажуць, што пошліны на аўто зусім і не павысяцца з першага ліпеня». Чуткі дайшлі і да народных выбраннікаў. А як вядома, мінімізаваць уздзеянне чутак на арганізм здольная толькі... інфармацыя ад кампетэнтных асоб. Добра, што дэпутаты не запытваюць. На нядаўнім пасяджэнні пастаяннай камісіі па міжнародных справах і сувязях з СНД дэпутат Уладзімір Кужанаў пацікавіўся ў першага намесніка міністра замежных спраў Ігара Петрышэнкі, ці маюць пад сабой падставы апошнія чуткі пра тое, што пошліны на легкавыя аўто не будуць павышаны. Першы намеснік міністра заявіў, што яму пра такія планы нічога не вядома, і падкрэсліў:

— Абавязацельствы (якія павышаюць стаўкі мытных пошлін на ўвоз аўто да ўзроўню расійскіх з першага ліпеня. — **Аўт.**) прыняты, і ўмовы няўхільна выконваюцца нашай краінай.

Што можа азначаць, на наш погляд, толькі адно: успрымаць варта толькі афіцыйныя заявы, а не домыслы...

Першы намеснік міністра дадаў таксама, што з беларускага боку робіцца ўсё, каб на беларуска-расійскай мытнай мяжы не было ніякага мытнага кантролю і ўсе кантрольныя працэдуры былі перанесены на знешні контур. Першы намеснік міністра ўдакладніў, што да першага ліпеня расійскі бок захоўвае за сабой права здзяйсняць выбарачны мытны кантроль па таварах трэціх краін, што датычыцца і легкавых аўтамабіляў.

Абмяркаваўшы на пасяджэнні два дакументы па Мытным саюзе, камісія прыняла рашэнне рэкамендаваць Палаце прадстаўнікоў ратыфікаваць іх. Адзін з разгледжаных дакументаў датычыцца дзейнасці Камісіі Мытнага саюза. Прапанаваныя папраўкі скіраваны, паводле слоў першага намесніка міністра, на павышэнне эфектыўнасці функцыянавання гэтай структуры. Рашэнні камісіі зараз уводзяцца ў дзеянне толькі праз месяц пасля іх афіцыйнага апублікавання. Тым часам у шэрагу выпадкаў сітуацыя вымагае больш аператыўнасці. Таму прапануецца юрыдычна замацаваць магчымасць устанаўліваць іншыя тэрміны, істотна меншыя за 30 каляндарных дзён. Настолькі хутка, наколькі таго патрабуе сітуацыя. Агаворка толькі адна: рашэнні могуць быць уведзены ў дзеянне не раней за дату апублікавання.

Змены закранулі не толькі хуткасць прыняцця рашэнняў, але і паўнамоцтвы Камісіі. Ёй, напрыклад, даецца права ствараць каардынацыйныя і кансультацыйныя органы — для разгляду прапаноў і ўзгаднення пазіцый дзяржаў-удзельніц.

**Зоя ВАРАНЦОВА.**

## ГУУС Мінгарвыканкама прапануе аб'явіць днём цвярозасці 11 чэрвеня —

Дзень школьных выпускных вечароў у сталіцы — і абмежаваць продаж спіртнога ў крамах горада. 11 чэрвеня ў кожнай сталічнай школе будуць дзяжурыць не менш за два супрацоўнікі праваахоўных органаў.

**Святлана ФРАЛЯНКОВА,** *«Мінск—Навіны».*

# ПРЭЗІДЭНТЫ БЕЛАРУСІ І КАЗАХСТАНА ВЫКАЗАЛІ ЗАДАВАЛЬНЕННЕ ВЫНІКАМІ АФІЦЫЙНАГА ВІЗІТУ АЛЯКСАНДРА ЛУКАШЭНКІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Аляксандр Лукашэнка адзначыў імклівае развіццё Казахстана і яго сталіцы Астаны. «Мы хацелі б падключыцца да гэтых грандыёзных планаў. І мы хацелі б, каб Казахстан выкарыстоўваў усё тое, што ў нас было накоплена ў савецкі перыяд, і тое, што мы змаглі падтрымаць і развіць цяпер. Мы гатовы ісці ў Казахстан, кааперавацца, мы гатовы выраблять сумесна тут усё, што неабходна для Казахстана. Мы крайне зацікаўлены ў тым, каб працаваць на казахстанскай зямлі», — заявіў кіраўнік беларускай дзяржавы. Асновай такога супрацоўніцтва служыць узаемадапаўняльнасць эканомік дзвюх краін. Як адзначыў беларускі лідар, у Беларусі і Казахстана практычна няма канкурэнтных вытворчасцяў. «Усё, што вырабляем мы, патрэбна Казахстану. Усё, што вырабляе Казахстан, спажываецца ў Беларусі», — адзначыў ён.

Прэзідэнт Беларусі паведаміў, што цяпер рэалізуюцца многія сумесныя беларуска-казахстанскія праекты коштам больш як $100 млн, а тавараабарот дзвюх краін наблізіўся да $1 млрд. «Упэўнены, што гэта толькі пачатак і ў нас наперадзе нармальнае будучае ў нашых адносінах. Мы гатовы падключыцца да вашых праграм па індустрыялізацыі краіны», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

Нурсултан Назарбаеў адзначыў, што Беларусь змагла захаваць сваю эканамічную магутнасць як краіна, дзе добра развіта перапрацоўчая прамысловасць, у той час як Казахстан з'яўляецца краінай, якая здабывае сыравіну. Менавіта таму эканомікі дзвюх дзяржаў узаемадапаўняльныя. «Мы зазірнулі і ў будучыню — па ўдзелу казахстанскіх кампаній у прыватызацыі аб'ектаў буйной прамысловасці ў Беларусі. Нас цікавіць машынабудаванне, хімічная прамысловасць, нафтаперапрацоўка, сельская гаспадарка. Я лічу, што казахстанскія кампаніі прымуць актыўны ўдзел у праграмах прыватызацыі ў Беларусі», — заявіў Прэзідэнт Казахстана, адзначыўшы, што гэта будзе садзейнічаць павелічэнню ўзаемнага патоку інвестыцый.

У сваю чаргу Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка паведаміў, што ў ходзе перагавораў бакі дамовіліся аб стварэнні новых сумесных прадпрыемстваў не толькі ў Казахстане, але і ў Беларусі з удзелам казахстанскага капіталу. У прыватнасці, кіраўнік беларускай дзяржавы адзначыў, што Казахстан праяўляе цікавасць да высокатэхналагічных прадпрыемстваў Беларусі. Сярод тых, куды могуць прыйсці казахстанскія інвестыцыі, беларускі лідар назваў «Інтэграл». «Мы таксама зацікаўлены ў інвестыцыях у гэта прадпрыемства. Мне падабаецца прапанова Прэзідэнта Казахстана, і ў бліжэйшы час мы прымем гэта рашэнне ў Беларусі, а таксама па шэрагу іншых прадпрыемстваў», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Сярод пераваг супрацоўніцтва з Казахстанам у інвестыцыйнай сферы Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ў гэтай краіны закладзены вельмі добрыя кантакты з высокатэхналагічнымі краінамі ў Азіі, такімі як Рэспубліка Карэя і Японія. «Мы бачым тут не толькі інвестыцыі з Казахстана ў такія прадпрыемствы, але і вельмі добрую сувязь Беларусі праз Казахстан з азіяцкімі «монстрамі», якія ў гэтых адносінах рушылі наперад», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Урадам Беларусі і Казахстана даручана падрыхтаваць да падпісання двухбаковае міжурадавае пагадненне аб гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве ў галіне паставак нафты і нафтапрадуктаў у Беларусь. Аб гэтым гаворыцца ў сумеснай заяве прэзідэнтаў Беларусі і Казахстана.

Сярод прыярытэтных напрамкаў — «развіццё энергетычнага дыялога паміж Беларуссю і Казахстанам, паступальнае напаўненне яго практычным зместам, уключаючы падрыхтоўку да падпісання двухбаковага міжурадавага пагаднення аб гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве ў галіне паставак нафты і нафтапрадуктаў у Беларусь з улікам міжнародных абавязацельстваў абедзвюх дзяржаў».

# ЗБРОЯ І ІНАВАЦЫІ

**У Мінску адкрылася міжнародная выстаўка ўзбраення і ваеннай тэхнікі «MILEX-2011»**



**Амаль 150 арганізацый, прадпрыемстваў і ўстаноў з Беларусі, Расіі, Украіны, Казахстана і Арменіі прымаюць удзел у працы 6-й Міжнароднай выстаўкі ўзбраення і ваеннай тэхнікі «MILEX-2011». Адна з найбольш цікавых экспазіцый — калектыўная экспазіцыя дзяржаў-членаў АДКБ.**

— «MILEX» сёння — адна з самых значных выстаў Беларусі, — зазначыў **намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Сяргей РУМАС**. — За кароткі 10-гадовы тэрмін выстаўка набыла статус сур'ёзнага міжнароднага форуму. «MILEX» — таксама і важны маркетынгавы інструмент, які спрыяе станаўленню і развіццю дзелавых адносін. Выстаўка прызначаная наглядна прадэманстраваць інтэлектуальны і прамысловы патэнцыял эканомікі Беларусі, яна стала пляцоўкай, на якой праходзяць апрабацыю самыя смелыя і перспектыўныя праекты.

— Развіццё абаронна-прамысловага комплексу — гэта гарантыя бяспекі дзяржаў, якія ўпэўнена стаяць на пазіцыі кансалідацыі намаганняў па стварэнні сістэмы агульнай бяспекі, — дадаў **генеральны сакратар АДКБ Мікалай БАРДЗЮЖА**.

Летась выстаўку наведала больш за 29 тысяч чалавек, і згодна з сёлетнімі прагнозамі, паказчыкі будуць не горшымі.

— Выстава цікавая, узровень вельмі высокі і сучасны, — прызнаўся «Звяздзе» **аташэ па пытаннях абароны Пасольства ФРГ падпалкоўнік Нільс ЯНЭКЕ**. — Цяжка параўноўваць нашы арміі і ваенную сілу, бо ў нас выкарыстоўваецца іншая вайсковая сістэма. Але асабліва цікава было ацаніць узоры беларускай паветранай абароны, з якімі я азнаёміўся.

Сярод ганаровых экспанентаў на выстаўцы прадстаўлена і прадпрыемства «Казспецэкспарт» міністэрства абароны Рэспублікі Казахстан.

— Мы з'яўляемся асноўным пастаўшчыком узбраення і ваеннай тэхнікі для патрэбаў узброеных сіл Казахстана, — распавяла «Звяздзе» **начальнік аддзела дакументальнага забеспячэння Шалпан РЫСМЕНДЗІЕВА**. — Мы вельмі рады запрашэнню Беларусі і лічым, што «MILEX» — цудоўная рэкламная пляцоўка для нас.

— На сёння ў Беларусі ў нас зарэгістравана сумеснае беларуска-расійскае прадпрыемства «РТС», якое спецыялізуецца на сістэме перадачы маўлення на пэўных частотах, — расказала «Звяздзе» **намеснік начальніка аддзела маркетынгу Расійскага інстытута знешняга радыёбудаўніцтва Ганна АНКУДЗІНКАВА**. — У нас створана новае абсталяванне радыёсувязі і вяшчання на пэўных частотах і хвалях — расійскія распрацоўкі сумеснай зборкі, якія выкарыстоўваюцца сёння на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь. Сваю працу ў Беларусі мы пачыналі пяць гадоў таму. Водгукі ад супрацоўніцтва з Беларуссю толькі станоўчыя.



— Мы прадстаўляем беларускае оптыка-механічнае аб'яднанне (БелОМА), — дадае **намеснік начальніка аддзела збыту БелОМА Сяргей ВЕРЛУП**. — Наша аб'яднанне — лідар у вытворчасці баявой оптыкі, якая прымяняецца ў многіх сферах (бранятанкавая тэхніка, стралковае ўзбраенне і інш.). У асноўным робім прадукцыю на экспарт. Тут мы прэзентуем новыя ўзоры сваёй прадукцыі — прыцэлы, прыборы назірання.

Сваімі распрацоўкамі парадаваў на выстаўцы і **Інстытут машынабудавання НАНБ**. Сярод прадстаўленых навінак — праграмна-кіруемыя прывадныя сістэмы, новыя звышцвёрдыя матэрыялы...

Адным з ноу-хау інстытута стаў распрацаваны сумесна з ААТ «МАЗ» шматзвеннявы магістральны аўтацягнік павялічанай даўжыні і грузапад'ёмнасці. Аўтацягнік прызначаны для хуткасных перавозак вялікіх аб'ёмаў грузаў на далёкія і звышдалёкія адлегласці па міжгародных, міжнародных і трансkантынентальных трасах. Адным з асноўных трансkантынентальных маршрутаў такога цягніка, паводле слоў спецыялістаў Інстытута, можна лічыць напрамак Брэст—Масква—Уладзівасток—Пекін.

— Выстаўка шостая па ліку, але, нягледзячы на гэта, яна зарэкамендавала сябе як перспектыўная, — заявіў **старшыня Дзяржаўнага ваенна-прамысловага камітэта Беларусі Сяргей ГУРУЛЁЎ**. — Найперш пра гэта гаворыць колькасць удзельнікаў — сёлета іх значна больш. Усё сведчыць аб тым, што ваенна-прамыслова комплекс Беларусі мае перспектывы на будучыню. Найперш — гэта пляцоўка зносін, пляцоўка новых поглядаў на сістэму ўзбраення.

Выстаўка «MILEX-2011» размешчана ў выставачным павільёне НВК «Белэкспа» па адрасе: г. Мінск, пр-т Пераможцаў, 14. Сваю працу выстаўка працягне да 27 мая ўключна.

**Ілья ЛАПАТО.**
**Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.**



## У пажары на Аршанскім мясакансервавым камбінаце загінулі 4 чалавекі

Учора каля 15.00 стала вядома аб тым, што на Аршанскім мясакансервавым камбінаце адбылося ўзгаранне ўцяплялыніка на плошчы прыкладна 400 кв.м у галерэі на ўзроўні 3-га паверха ў будынку халадзільнай установы. Для ліквідацыі пажару былі задзейнічаны 11 адзінак аварыйнай пажарна-выратавальнай тэхнікі і 47 супрацоўнікаў МНС. Пры дапамозе спецыяльнай лесвіцы з будынка былі выратаваны 9 чалавек, яшчэ 14 эвакуіравалі па звычайных лесвічных маршах. Каб справіцца з агнём, падраздзяленням МНС спатрэбілася амаль гадзіна. Паколькі існавала пагроза разгерметызацыі халадзільнай устаноўкі, было праведзена перапампоўванне аміяку ў аб'ёме 20 т у рэзервовую ёмістасць. Прычыны пажару цяпер высвятляюцца.

**БЕЛТА.**

## Жалеза супраць статка

**У Асіповіцкім раёне цягнік урэзаўся ў статак кароў — 19 жывёл загінулі.**

Уначы 24 мая грузавы цягнік «Мінск—Гомель» паблізу станцыі Татарка збіў кароў. Статак амаль у дзве сотні кароў, што належыць сельгаспрадпрыемству «Калгас «Ясень», прарваўся праз «электрычнага пастуха» і гуляў каля чыгункі. У выніку сутыкнення загінулі жывёлы, а таксама пашкоджаны лакаматыў. Пасля дзвюхгадзіннага спынення рух цягнікоў аднавілі.

**Алена КАЗЛОВА.**

Дзеля памяці

# «У Максіма на кашулі вышыты лісточкі...»

**З кветкамі да помніка Багдановіча ў Мінску можна прыходзіць сёння, у дзень памяці беларускага паэта.**

Сёлета прыгожа квітнее май: розных фарбаў і пахаў навокал хапае, на рамантыку натхняе яркае сонца, цеплынёй ахінае паветра — здаецца, поўніцца пяшчотнай лірыкай. Можа, паэзія раствораная навокал і словы самі ўзнікаюць, узгадваюцца, усплываюць з памяці. Хочацца вершаў, якія у гэтай штодзённай завядзёнцы адарвалі б ад зямлі і ўзнялі да аблокаў: усё-такі чалавек — істота касмічная, таму што душа яго прагне палёту. І тым, хто не можа раскрыць сам свае крылы, прыходзіць на дапамогу паэзія.

Напэўна, не проста так узнікла гэтае адчуванне: ідзе юбілейны год Максіма Багдановіча. 25 мая, у дзень яго памяці, Беларусь будзе ўспамінаць Максіма. Ужо з дванаццаці гадзін ля помніка паэту ў Мінску збяруцца людзі з кветкамі. І з вершамі. Нам ёсць што сказаць пра яго, ёсць што прачытаць з яго — паэт пісаў пра нас, і яго словы не састарэлі. Дадзена паэтам такая якасць — яны нібыта бяруць інфармацыю з прасторы і ведаюць наперад усё пра магчымыя варункі чалавечага жыцця. І пра свой шлях усё разумеюць і прымаюць яго, як Богам дадзена. І пра будучыню сваёй паэзіі ведаюць. Вось як Максім Багдановіч:

*Ціхія мае ўсе песні,*
*цёмныя, як вугаль чорны,*
*Але ўсё ж яны засвецяць,*
*калі я ў агні мучэння*
*Іх разжару, распалю;*
*А як згасне ён, — дык бліснуць,*
*быццам дыяментаў зёрны,*
*Бо абернуцца, застыўшы,*
*ў драгацэнныя камені*
*Ў час, як я лягу ў зямлю.*

Пра каштоўнасць слоў паэта будзе каму сказаць сёння: на літаратурна-музычную імпрэзу ў скверы ля Нацыянальнага акадэмічнага тэатра оперы і балета збяруцца афіцыйныя асобы, вядомыя дзеячы культуры, мастакі. Прыйдуць і сучасныя паэты з вершамі. Запяюць спевакі свае песні — пра чалавека і яго бессмяротную душу, якая праз думкі і словы застаецца з намі.

Максімава душа павінна радавацца: яго памятаюць. Яго ўспамінаць можна пастаянна: шмат ён думаў і казаў пра сваю радзіму, якую любіў і жадаў ёй знайсці свой шлях. І мы любім... Яго ўзгадваюць, калі кахаюць, таму што ведаў, як жыць гэтым пачуццём, ціха радавацца яму, нават не маючы надзеі на жыццё. І мы хочам кахаць вечна... Яго ўзгадваюць, калі вучацца захапляцца светам, радавацца свайму лёсу і верыць, што ён вядзе, нават калі перайшоў мяжу...

Яго памінаць і маліцца за душу паэта ў іншым свеце будуць у Свята-Петра-Паўлаўскім саборы ў 14.30.

Літаратурны музей імя Максіма Багдановіча а 16-й гадзіне запрашае на «паэтычна-музычную вандроўку ў краіну светлага суму». Пра паэта будуць распавядаць музейныя экспанаты, мастацтва Эдуарда Агуновіча і музыка ад трыа «Вытокі». Вядома і вершы Багдановіча:

*Спеў залунаў —*
*і сама адгукнулася чула на ліры*
*Звонам ціхуткім струна...*
*Ці адзавецеся Вы?*

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ

**ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО «МОГИЛЕВСКИЙ ЗАВОД ИСКУССТВЕННОГО ВОЛОКНА» ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН ПО ПРОДАЖЕ НЕДВИЖИМОСТИ**
**Аукцион состоится 28 июня 2011 года в 14.00 по адресу: г. Могилев, ул. Челюскинцев, 105.**

Собственник, продавец и организатор аукциона:
ОАО «Могилевский завод искусственного волокна», г. Могилев, ул. Челюскинцев, 105.
Контактный телефон (8 0222) 29 75 13.

| № лота | Наименование объекта | Краткая характеристика | Начальная цена продажи, руб., с НДС | Сумма задатка, руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Объект незавершенного строительства «Азотная станция» | Начало строительства 1992 г., общая площадь объекта – 612 м², степень готовности 72%. Земельный участок находится в составе государственного акта на земельный участок промышленной площадки | 458 000 000 | 45 800 000 |

Аукцион по лоту № 1 проводится по методу понижения начальной цены. Стартовая цена 458 000 000 белорусских рублей. Минимальная цена продажи 91 600 000 белорусских рублей.

Объект расположен по адресу: г. Могилев, ул.Челюскинцев, 105, не зарегистрирован в ЕГРНИ.

Земельный участок расположен в водоохранной зоне р. Днепр, в которой устанавливается специальный режим хозяйственной деятельности, которая должна осуществляться с соблюдением мероприятий, предотвращающих загрязнение, засорение и истощение вод.

Заявителю для участия в аукционе необходимо в срок, указанный в извещении, внести задаток, заключить соглашение о правах и обязанностях сторон, а также представить необходимый пакет документов в соответствии с действующим законодательством.

Задаток перечисляется не позднее 27 июня 2011 года на счет ОАО «Могилевский ЗИВ»: р/с 3012110491015 в Могилевском региональном отделении ОАО «Белвнешэкономбанк» код 202, УНН 790133562, ОКПО 291562437000.

**Заявки принимаются ежедневно в рабочие дни с 9 до 17 часов по адресу: г. Могилев, ул. Челюскинцев, 105, ОАО «Могилевский ЗИВ», каб. 315.**

Последний день подачи заявок: **27 июня 2011 года до 17.00.** Заключительная регистрация участников аукциона состоится **28 июня 2011 года** с 13.30 до 14.00 в зале заседания ОАО «Могилевский ЗИВ».

Всем желающим предоставляется возможность предварительного ознакомления с объектом аукциона.

Победителем признается участник, предложивший наибольшую цену.

Продавец имеет право снять предмет аукциона с торгов не позднее 3-х дней до его проведения, о чем извещаются участники.

Срок заключения договора – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания сторонами протокола о результатах проведения торгов.

Задаток засчитывается в счет оплаты приобретенного объекта. Победитель аукциона в течение 5 рабочих дней, после проведения торгов возмещает фактические затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением документации, необходимой для его проведения.

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### Падчас візіту Махмуда Ахмадзінежада на нафтаперапрацоўчым заводзе адбыўся выбух

**Два чалавекі загінулі, яшчэ 12 атрымалі сур'ёзныя раненні ў выніку выбуху на нафтаперапрацоўчым заводзе ў горадзе Абадан на паўднёвым захадзе Ірана. Інцыдэнт адбыўся ў аўторак раніцай. Выбух прагрымеў падчас візіту на прадпрыемства прэзідэнта краіны Махмуда Ахмадзінежада. Сам прэзідэнт не пацярпеў і неўзабаве, як і планавалася, выступіў у прамым эфіры на тэлебачанні.**

Паводле інфармацыйнага агенцтва Fars, Ахмадзінежад браў удзел у цырымоніі адкрыцця трэцяй лініі па вытворчасці бензіну. Пасля выбуху пачаўся моцны пажар. Агонь праз некаторы час удалося патушыць, аднак густыя клубы дыму распаўсюдзіліся на значную частку горада. На прадпрыемстве маюцца разбурэнні. Паводле папярэдніх звестак, выбух быў выкліканы ўцечкай газу. Усяго ў выніку пацярпелі 22 чалавекі.

### Ва Украіне затрымана экс-прэм'ер Юлія Цімашэнка

**Экс-прэм'ера Украіны, лідара апазіцыйнай партыі «Батькивщина» Юлію Цімашэнку затрымала генеральная пракуратура краіны падчас допыту ў Галоўным следчым упраўленні ў аўторак. Як паведаміў журналістам начальнік аддзела ГСУ Алег Пушкар, Цімашэнку затрымалі па рашэнні Пячэрскага раённага суда Кіева для правядзення следчых дзеянняў.**

Паводле яго слоў, «следчыя звярнуліся ў суд, паколькі Цімашэнка сарвала следчыя дзеянні». «Цяпер з Юліяй Уладзіміраўнай будуць праведзены следчыя дзеянні, пасля чаго, яна, цалкам магчыма, пойдзе дахаты», — дадаў Пушкар.

### Ад udараў маланак у Бангладэш загінула 40 чалавек

**Ад udараў маланак падчас наймацнейшай буры ў Бангладэш загінула 40 чалавек, больш за 150 чалавек атрымала апёкі і раненні рознай ступені цяжкасці, паведамляюць інфармагенцтвы.**



Загінулыя — галоўным чынам сяляне, якіх бура заспела падчас палявых работ, а таксама рыбакі. Шматлікія навальнічныя разрады былі зафіксаваны на паўночным захадзе Бангладэш 23 мая падчас штармавых лівняў.

## «Прамая лінія»

### ХВАРОБЫ САСУДАЎ І СЭРЦА: ФАКТАРЫ РЫЗЫКІ, ЛЯЧЭННЕ, ПРАФІЛАКТЫКА

Захворванні сэрца і сасудаў — лідары ў спісе паталогій, якія пагражаюць здароўю чалавека. І менавіта яны — асноўная прычына смяротнасці і інваліднасці сярод дарослага насельніцтва. Да сардэчных катастроф могуць прыводзіць многія прычыны. Пра гэта і не толькі мы пагаворым на чарговай «прамой лініі». У ёй возьмуць удзел **загадчык інфарктнага аддзялення 10-й гарадской клінічнай бальніцы г. Мінска Наталля Якаўлеўна ПАЛЯЎКОВА і ўрач-кардыёлаг таго ж аддзялення Ірына Віктараўна ГРЫШЫНА**.

«Прамая лінія» адбудзецца **сёння з 15.00 да 16.00** па нумарах: **8 (017) 292 38 92 і 292 38 21**.

## «Прамая лінія»

### ПЕНСІЙНЫЯ НЮАНСЫ ПЛЮС АДРАСНЫЯ ВЫПЛАТЫ

Пенсіі і адрасная сацыяльная дапамога. Няма сумненняў, што дзве гэтыя тэмы з'яўляюцца актуальнымі для многіх. Таму менавіта ім і будзе прысвечана чарговая «прамая лінія» нашай газеты з удзелам **намесніка міністра працы і сацыяльнай абароны Валянціны Вікенцьеўны КАРАЛЁВАЙ**.

Такім чынам, увага. Паводле папярэдняй дамоўленасці, наша «прамая лінія» будзе праходзіць **31 мая з 12 да 13 гадзін** па рэдакцыйных тэлефонах **(8 017) 292 38 92 і 292 38 21**. **Нумар для папярэдніх пытанняў — (8 017) 287 17 57.**

## Абзац

◢ У Мінску з'явіліся першыя трамітадоры. Так называюць людзей, гатовых за грошы адстаяць у чарзе замест кліента. Першае ў Беларусі агенцтва па аказанні арыгінальнай паслугі — стаянні ў чарзе — зарэгістравана ў адміністрацыі Ленінскага раёна сталіцы. Прафесійныя стаяльшчыкі гатовы правесці за кліента час у чарзе ў пасольствах розных краін, у выканкамах Мінска, загсах і ДАІ. Расцэнкі фіксаваныя: з 8.00 да 19.00 за адну гадзіну стаяння ў чарзе з кліента возьмуць Br10 тыс., з 19.00 да 1.00 і з 6.00 да 8.00 — Br15 тыс. А начныя тарыфы самыя высокія: з 01.00 да 06.00 давядзецца заплаціць Br17 тыс. за гадзіну.

◢ **Пасажырскі аўтобус і МАЗ сутыкнуліся ў Мінску. Апоўдні кіроўца аўтобуса, які ехаў па маршруце № 13, пры павароце налева на вул. Каліноўскага ў кірунку Лагойскага тракту не саступіў дарогу грузавіку МАЗ. Адбылося сутыкненне. У выніку пацярпела 7 пасажыраў аўтобуса, іх даставілі ў бальніцы.**

◢ Найменшым алфавітам у свеце з'яўляецца алфавіт мовы ратакас. На ім гавораць жыхары часткі вострава Бугенвіль, што ўваходзіць у групу Саламонавых астравоў у Ціхім акіяне. У алфавіце ратакас усяго 12 літар, у аснове якіх лацініца: AEGIKOPRSTUV. Гэтыя літары выкарыстоўваюцца для запісу адзінаццаці гукаў. Моваю ратакас гавораць усяго 4,3 тыс.чалавек.

## Поўны абзац

◢ **У бразільскай дзяўчыны проста на вуліцы скралі прычоску. Інцыдэнт адбыўся на аўтобусным прыпынку горада Гаянія. 24-гадовая бразільянка чакала прыбыцця грамадскага транспарту, у гэты час зламыснік падбег да яе, абрэзаў валасы нажом і знік. Як мяркуецца, валасы могуць быць выкарыстаныя для вырабу натуральнага дарагога парыка. На карысць гэтай версіі гаворыць тое, што ў ахвяры былі доўгія, дагледжаныя і непафарбаваныя валасы. Дзяўчына адразу ж звярнулася ў паліцыю. Прадстаўнік паліцыі прызнаўся, што за 20 гадоў ён ні разу не сутыкаўся з выпадкам крадзяжу валасоў. Зламыснік вышукваецца.**

***Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.***

# Тарыфы на праезд унутрырэспубліканскімі пасажырскімі цягнікамі ў Беларусі павышаць не будуць

**Аб гэтым паведаміў учора на прэс-канферэнцыі начальнік аддзела пасажырскай службы Беларускай чыгункі Уладзімір Столяр, перадае БЕЛТА.**

У той жа час з заўтрашняга дня падаражэе кошт праезду ў цягніках, якія курсіруюць у краіны далёкага замежжа. Уладзімір Столяр растлумачыў, што разлікі па перавозках, якія выконваюцца па такіх маршрутах, вядуцца ў еўра. «Нацбанк Беларусі павысіў курс еўра, адпаведна і кошт праезду ў цягніках такога прызначэння ў нас з заўтрашняга дня павялічыцца прапарцыянальна росту курсу еўра», — адзначыў спецыяліст.

Вырасце і кошт праезду ў пасажырскіх цягніках у краіны СНД і Балтыі. «Сама велічыня тарыфаў з заўтрашняга дня не змяняецца, але з улікам сітуацыі на беларускім валютным рынку і павышэння курсу швейцарскага франка, у якім вядуцца разлікі па гэтых напрамках, кошт праезду ў паяздах, якія едуць у краіны СНД і Балтыі, вырасце адэкватна росту курсу швейцарскага банка», — расказаў прадстаўнік БЧ.

## Извещение о проведении 27 июня 2011 года открытого аукциона по продаже недвижимого имущества

| | |
|---|---|
| **Предмет торгов (наименование и характеристики продаваемого имущества)** | **Административное помещение общей площадью 900,6 кв.м, инвентарный номер 500/D-708013013 (помещение расположено на первом и втором этажах двухэтажного здания)** |
| **Местонахождение продаваемого имущества** | г. Минск, ул. Радиальная, д. 40, корп. 1, пом. 3 |
| **Сведения о продавце** | ОАО «Минский ПКТИ», ул. Радиальная, д. 40, корп. 1, 220070, г. Минск |
| **Сведения об организаторе аукциона** | УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск |
| **Начальная цена предмета торгов, без учета НДС** | 1 866 585 000 белорусских рублей |
| **Сумма задатка** | 180 000 000 белорусских рублей |
| **Наличие обременений** | Аренда |

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона; заверенные копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка; а также иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет № 3012104971019, в региональной дирекции № 700 ОАО «БПС-Банк», г. Минск, код 153001369, получатель – УП «Минский городской центр недвижимости», УНП 190398583.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемое имущество. Процедура проведения торгов установлена порядком проведения аукциона.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, осуществляется участником, выигравшим торги.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается в течение 10 рабочих дней с даты проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в течение 30 календарных дней с даты заключения договора купли-продажи.

Аукцион состоится **27 июня 2011 года в 15.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 25.05.2011 по 24.06.2011** включительно в рабочие дни с 09.00 до 17.00 (в пятницу – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок: (017) 227 48 36, (017) 295 75 05.**

**Сайт в интернете: www.mgcn.by.**

## НАБЛЮДАТЕЛЬНЫЙ СОВЕТ ОАО «БЭМЗ»

**ИЗВЕЩАЕТ СВОИХ АКЦИОНЕРОВ О ПРОВЕДЕНИИ 6 июня 2011 года в 14 часов в клубе завода по адресу: г. Брест, ул. Московская, 202 ВНЕОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ**

**Повестка дня:**
1. **О выплате дивидендов за 2010 год.**
2. **О внесении дополнения в Устав ОАО «БЭМЗ».**

Регистрация участников собрания с 13 часов. Акционерам иметь при себе удостоверение личности, представителям — доверенность. Список лиц, имеющих право на участие в собрании, будет составлен по состоянию реестра акционеров на 20 мая 2011 года.

Ознакомление акционеров с материалами по вопросам повестки дня собрания: в рабочие дни (понедельник–пятница), начиная с 30 мая 2011 года в отделе кадров ОАО «БЭМЗ», 6 июня — по месту проведения собрания.

Справки по телефону: (8 0162) 42 16 83.

УНП 200032892

***Наблюдательный совет ОАО «БЭМЗ».***

# РАСКЛАД РУХУ ЭЛЕКТРАЦЯГНІКОЎ з 29 мая 2011 года

## НА МАЛАДЗЕЧНА

**ПРАМЫЯ БЕСПЕРАСАДАЧНЫЯ ЗНОСІНЫ** (інфармацыя аб наяўнасці прыпынкаў гэтых цягнікоў знаходзіцца ў прыведзенай ніжэй табліцы)

— эл. ц. **Барысаў — Маладзечна** адпр. са ст. Барысаў **04-38**, Мінск-Пас. **06-21 — 06-32**, прыб. на ст. Маладзечна ў **08-17 (штодня);**

— эл. ц. **Пухавічы — Аляхновічы** адпр. са ст. Пухавічы **09-00**, Мінск-Пас. **10-17 — 10-40**, прыб. на ст. Аляхновічы ў **11-48.**

| Маршрут | Адпр. | Прыб. | Дні | Прыпынкі |
|---|---|---|---|---|
| *Адпраўленне са ст. МІНСК-ПАСАЖЫРСКІ* | | | | |
| Маладзечна | 0-25 | 2-04 | штодня | б/п Радыятарны, Лябяжы, Таташчызна, Селівонаўка |
| Маладзечна | 4-37 | 6-08 | штодня | б/п Радыятарны, Лябяжы, М.Мора, Крыжоўка, Зялёнае, Хмелеўка, Анусіна, Вязынка, Пралескі |
| Маладзечна | 5-17 | 7-06 | штодня | б/п Лябяжы |
| Аляхновічы | 6-09 | 7-11 | штодня | б/п Хмелеўка |
| Маладзечна | 6-32 | 8-17 | штодня | б/п Крыжоўка |
| Аляхновічы | 6-52 | 8-00 | штодня | усюды |
| Маладзечна | 7-25 | 9-20 | штодня | усюды |
| Аляхновічы | 8-21 | 9-28 | вых. | усюды |
| Маладзечна | 8-31 | 10-17 | штодня | усюды |
| Аляхновічы | 8-59 | 10-07 | вых. | усюды |
| Маладзечна | 9-14 | 10-59 | штодня | усюды |
| Аляхновічы | 9-38 | 10-50 | вых. | усюды |
| Маладзечна | 10-09 | 11-54 | штодня | усюды |
| Аляхновічы | 10-40 | 11-48 | вых. | усюды |
| Маладзечна | 11-18 | 13-03 | штодня | усюды |
| Аляхновічы | 12-01 | 13-09 | вых. | усюды |
| Маладзечна | 12-36 | 14-22 | штодня | усюды |
| Аляхновічы | 13-05 | 14-13 | нядз. | усюды |
| Маладзечна | 13-37 | 15-22 | штодня | усюды |
| Маладзечна | 14-19 | 16-04 | пт., вых. | б/п Селівонаўка |
| Уша | 15-04 | 16-29 | пт., нядз. | усюды |
| Маладзечна | 15-37 | 17-24 | штодня | усюды |
| Аляхновічы | 15-53 | 17-01 | пт., вых. | усюды |
| Маладзечна | 16-39 | 18-31 | штодня | усюды |
| Аляхновічы | 17-26 | 18-34 | штодня | усюды |
| Маладзечна | 17-47 | 19-19 | штодня | б/п М.Мора, Крыжоўка, Зялёнае, Хмелеўка, Анусіна, Вязынка, Пралескі, Раманы |
| Маладзечна | 18-09 | 20-03 | штодня | усюды |
| Аляхновічы | 18-29 | 19-46 | штодня | усюды |
| Маладзечна | 19-16 | 21-01 | штодня | усюды |
| Аляхновічы | 20-23 | 21-31 | штодня | усюды |
| Маладзечна | 20-54 | 22-40 | штодня | усюды |
| Маладзечна | 22-02 | 23-41 | штодня | б/п Радыятарны, Мясота, Таташчызна, Крыніца, Селівонаўка. |

## НА АСІПОВІЧЫ

**ПРАМЫЯ БЕСПЕРАСАДАЧНЫЯ ЗНОСІНЫ** (інфармацыя аб наяўнасці прыпынкаў гэтых цягнікоў знаходзіцца ў прыведзенай ніжэй табліцы)

— эл. ц. **Маладзечна — Асіповічы** адпр. са ст. Маладзечна **06-26**, Мінск-Пас. **8-15 — 8.26**, прыб. на ст. Асіповічы ў **10-43 (штодня);**

— эл. ц. **Маладзечна — Асіповічы** адпр. са ст. Маладзечна **8-34**, Мінск-Пас. **10-31 — 10-47**, прыб. на ст. Асіповічы ў **12-51 (па выхадных днях);**

— эл. ц. **Стоўбцы — Талька** адпр. са ст. Стоўбцы **15-30**, Мінск-Пас. **17-10 — 17-24**, прыб. на ст. Талька ў **19-02 (па выхадных днях).**

| Маршрут | Адпр. | Прыб. | Дні | Прыпынкі |
|---|---|---|---|---|
| *Адпраўленне са ст. Мінск-Пасажырскі* | | | | |
| Пухавічы | 0-19 | 1-29 | штодня | б/п Дрычын, Вендзеж, Тэхнікум |
| Асіповічы | 5-05 | 7-07 | штодня | б/п Чыгуначны |
| Пухавічы | 6-41 | 7-44 | прац. | б/п Лошыца, Чыгуначны, Седча, Зазерка, Раўнаполле, Н. Сяло, Дрычын, Тэхнікум |
| Асіповічы | 6-48 | 8-48 | штодня | б/п Рыбцы, Вендзеж |
| Пухавічы | 7-10 | 8-20 | вых. | б/п Чыгуначны, Асееўка, Зазерка |
| Талька | 7-59 | 9-38 | штодня | усюды |
| Пухавічы | 8-18 | 9-34 | вых. | б/п Чыгуначны |
| Асіповічы | 8-26 | 10-43 | штодня | усюды |
| Пухавічы | 9-08 | 10-25 | вых. | усюды |
| Асіповічы | 9-23 | 11-29 | штодня | усюды |
| Талька | 10-03 | 11-43 | вых. | усюды |
| Асіповічы | 10-47 | 12-51 | вых. | усюды |
| Асіповічы | 11-54 | 13-58 | штодня | усюды |
| Талька | 12-54 | 14-33 | вых. | усюды |
| Асіповічы | 13-24 | 15-29 | штодня | усюды |
| Пухавічы | 13-39 | 15-18 | вых. | усюды |
| Асіповічы | 14-16 | 16-20 | штодня | усюды |
| Асіповічы | 15-22 | 17-34 | штодня | усюды |
| Талька | 16-16 | 18-06 | штодня | усюды |
| Пухавічы | 17-02 | 18-21 | пт., вых. | б/п Чыгуначны, Зазерка, Рыбцы, Раўнаполле, Н. Сяло, Вендзеж |
| Талька | 17-24 | 19-02 | штодня | усюды |
| Асіповічы | 17-53 | 19-33 | штодня | б/п Чыгуначны, Асееўка, Седча, Зазерка, Рыбцы, Раўнаполле, Н. Сяло, Дрычын, Вендзеж, Веленскі, Блужа, Майскі, Весялоўскі, Вярхі |
| Талька | 18-04 | 19-41 | пт., вых. | б/п Чыгуначны |
| Пухавічы | 18-23 | 19-40 | штодня | усюды |
| Асіповічы | 18-42 | 20-27 | штодня | б/п Чыгуначны, Асееўка, Раўнаполле, Н. Сяло, Дрычын, Вендзеж, Блужа, Майскі, Весялоўскі, Вярхі |
| Асіповічы | 19-28 | 21-30 | штодня | б/п Вярхі |
| Пухавічы | 20-18 | 21-36 | штодня | усюды |
| Асіповічы | 20-46 | 23-00 | штодня | б/п Вярхі |
| *Адпраўленне з п.п. ІНСТЫТУТ КУЛЬТУРЫ* | | | | |
| Асіповічы | 6-01 | 7-37 | штодня | з/п Мінск-Паўднёвы, Калядзічы, Міханавічы, Рудзенск, Пухавічы, Юбілейны |
| Асіповічы | 6-09 | 8-12 | штодня | б/п Чыгуначны, Вярхі |
| Асіповічы | 22-31 | 0-29 | штодня | б/п Вендзеж, Веленскі, Весялоўскі, Вярхі |

## НА БРЭСТ

**ПРАМЫЯ БЕСПЕРАСАДАЧНЫЯ ЗНОСІНЫ** (інфармацыя аб наяўнасці прыпынкаў гэтых цягнікоў знаходзіцца ў прыведзенай ніжэй табліцы)

— эл. ц. **Асіповічы — Баранавічы** адпр. са ст. Асіповічы **11-53**, Мінск-Пас. **13-37 — 13-52**, прыб. на ст. Баранавічы ў **16-40 (па выхадных днях).**

| Маршрут | Адпр. | Прыб. | Дні | Прыпынкі |
|---|---|---|---|---|
| *Адпраўленне са ст. Мінск-Пасажырскі* | | | | |
| Баранавічы | 4-24 | 6-57 | штодня | б/п Пціч, Воўчкавічы, Бярэжа, Пяцігор'е, Станькава, Дзяржынск, Клыпаўшчына, Асіна, Мезінаўка, Атцэда, Кучкуны, Цёмныя Ляды |
| Стоўбцы | 8-01 | 9-54 | штодня | усюды |
| Брэст | 9-48 | 16-40 | штодня | усюды |
| Баранавічы | 13-52 | 16-40 | штодня | усюды |
| Баранавічы | 15-42 | 17-47 | штодня | з/п Курасоўшчына, Фаніпаль, Койданава, Дзяржынск, Негарэлае, Энергетык, Коласава, Стоўбцы, Гарадзея, Пагарэльцы, Пост 1 |
| Брэст | 16-20 | 22-53 | штодня | б/п Мезінаўка, Кучкуны |
| Стоўбцы | 17-45 | 19-24 | штодня | усюды |
| Негарэлае | 18-06 | 18-59 | прац. | з/п Курасоўшчына, Фаніпаль, Койданава, Дзяржынск |
| Стоўбцы | 18-30 | 20-16 | штодня | усюды |
| Баранавічы | 20-21 | 23-09 | штодня | б/п Сінява, Асіпаўшчына, Ліпа, Юшкавічы, Пабеда, Крошына |
| Баранавічы | 21-27 | 23-36 | штодня | з/п Курасоўшчына, Фаніпаль, Койданава, Дзяржынск, Негарэлае, Энергетык, Коласава, Стоўбцы, Гарадзея, Пост 1 |
| Стоўбцы | 22-57 | 0-27 | штодня | б/п Асіна, Мезінаўка, Атцэда, Кучкуны, Цёмныя Ляды |
| *Адпраўленне з п.п. ІНСТЫТУТ КУЛЬТУРЫ* | | | | |
| Брэст | 0-59 | 7-33 | штодня | б/п Рошча, Пціч, Бярэжа, Пяцігор'е, Станькава, Клыпаўшчына, Асіна, Мезінаўка, Атцэда, Кучкуны, Цёмныя Ляды, Сінява, Асіпаўшчына, Варацішча, Ліпа, Хвоева, Юшкавічы, Пабеда, Крошына, Пост 1 |
| Стоўбцы | 5-52 | 7-35 | штодня | усюды |
| Брэст | 7-00 | 13-54 | штодня | усюды |
| Стоўбцы | 7-39 | 9-15 | вых. | усюды |
| Баранавічы | 8-53 | 11-29 | штодня | б/п Сінява, Асіпаўшчына, Варацішча, Ліпа, Крошына |
| Стоўбцы | 9-27 | 11-04 | вых. | усюды |
| Стоўбцы | 10-20 | 11-55 | вых. | усюды |
| Стоўбцы | 11-10 | 12-55 | вых. | усюды |
| Брэст | 11-52 | 18-44 | штодня | усюды |
| Баранавічы | 12-53 | 14-28 | штодня | усюды |
| Стоўбцы | 14-45 | 16-31 | прац. | усюды |
| Гарадзея | 14-45 | 16-55 | вых. | б/п Сінява, Асіпаўшчына, Варацішча |
| Стоўбцы | 16-12 | 17-47 | пт., нядз. | усюды |
| Баранавічы | 17-11 | 20-05 | штодня | б/п Асіна, Мезінаўка, Атцэда, Кучкуны |
| Баранавічы | 19-15 | 22-00 | штодня | усюды |
| Стоўбцы | 22-07 | 23-43 | штодня | усюды |

## НА ОРШУ

**ПРАМЫЯ БЕСПЕРАСАДАЧНЫЯ ЗНОСІНЫ** (інфармацыя аб наяўнасці прыпынкаў гэтых цягнікоў знаходзіцца ў прыведзенай ніжэй табліцы)

— эл. ц. **Стоўбцы — Барысаў** адпр. са ст. Стоўбцы **05-31**, Інстытут Культуры **07-07 — 07-20**, прыб. на ст. Барысаў у **08-58 (штодня).**

| Маршрут | Адпр. | Прыб. | Дні | Прыпынкі |
|---|---|---|---|---|
| *Адпраўленне з п.п. ІНСТЫТУТ КУЛЬТУРЫ* | | | | |
| Орша (стаянка па ст. Барысаў 2-02 – 4-35) | 0-36 | 7-01 | штодня | б/п Дамашаны, Барсукі, Прал. Пабеда |
| Барысаў | 4-52 | 6-20 | штодня | б/п Слабада, Дамашаны, Загор'е, Барсукі |
| Орша | 5-17 | 9-00 | штодня | б/п Галошаўка, Дзятлава, Ламачына, Веравойша |
| Орша | 6-30 | 10-19 | штодня | усюды |
| Барысаў | 7-20 | 8-58 | штодня | усюды |
| Барысаў | 8-08 | 9-41 | штодня | усюды |
| Барысаў | 8-40 | 10-21 | штодня | усюды |
| Орша | 9-36 | 13-23 | вых. | усюды |
| Барысаў | 10-20 | 11-53 | вых. | усюды |
| Орша | 10-56 | 14-54 | штодня | усюды |
| Барысаў | 11-31 | 13-05 | вых. | усюды |
| Барысаў | 12-08 | 13-41 | штодня | усюды |
| Орша | 13-02 | 16-51 | штодня | усюды |
| Барысаў | 14-09 | 15-43 | прац. | усюды |
| Орша | 14-10 | 17-35 | вых. | да ст. Бобр — усюды, далей — з прыпынкамі па станцыях |
| Орша | 14-50 | 18-48 | штодня | усюды |
| Барысаў | 15-41 | 17-13 | штодня | усюды |
| Орша | 16-22 | 20-36 | штодня | усюды |
| Барысаў | 17-01 | 18-34 | штодня | усюды |
| Барысаў | 17-26 | 19-10 | штодня | усюды |
| Орша | 18-34 | 22-20 | штодня | б/п Выдзершчына, Перавалачны, Галошаўка, Дзятлава, Ламачына |
| Барысаў | 19-39 | 21-22 | штодня | усюды |
| Барысаў | 20-24 | 21-58 | штодня | усюды |
| Барысаў | 21-52 | 22-59 | штодня | з/п Мінск-Усх., Зарэчнае, Жодзіна-Паўдн., Печынскі |
| Барысаў | 22-25 | 00-06 | штодня | усюды |

*(Заканчэнне будзе.)*

# Міжнародныя аўтаперавозчыкі замахнуліся на 2,5-разовае павелічэнне экспарту паслуг да 2015 года

**ПА звестках Беларускай асацыяцыі міжнародных аўтамабільных перавозчыкаў (БАМАП), сёлета за першы квартал паступленні валютнай выручкі ад экспарту паслуг грузавога аўтамабільнага транспарту склалі 180,4 мільёна долараў, што на 61% больш, чым за аналагічны перыяд мінулага года.**

### Валюты ў перавозчыкаў пакуль хапае...

Нягледзячы на тое, што міжнародныя аўтамабільныя перавозчыкі маюць салідную валютную выручку, некаторыя цяжкасці з-за бягучай сітуацыі на валютным рынку адчулі і яны — калі раней яны атрымлівалі плацяжы ў валюце як ад рэзідэнтаў РБ, так і ад нерэзідэнтаў, то зараз яна паступае толькі ад апошніх:

— Напрыклад, беларускія заводы зараз за перавозку сваёй экспартнай прадукцыі плацяць беларускімі рублямі. А нам фінансаванне гэтай перавозкі трэба ажыццяўляць у валюце: сутачныя, паліва і гэтак далей. Але засталіся іншыя перавозкі, калі мы заказ атрымліваем ад нерэзідэнта РБ і ён пералічвае валюту на рахунак. Так што калі паглядзець і структурыраваць нашы аб'ёмы, то сітуацыя з'яўляецца дастаткова няпростай: аб'ёму ранейшай валютнай выручкі няма, — сказаў **Мікалай БАРАВЫ, старшыня асацыяцыі БАМАП**. — Я звычайна адкрываю сайт, дзе арганізацыі размяшчаюць інфармацыю пра патрэбу ў валютных рэсурсах. І мне цікава, — ці ёсць там транспартныя аператары. Калі ёсць — значыць, сітуацыя дрэнная; калі іх няма — значыць, яшчэ больш-менш. Паглядзеў, а там з 2-3 дзясяткаў, якія размясцілі інфармацыю, я налічыў некалькі транспартных кампаній. Вось вам і адказ на пытанне, закранула гэта наш сектар ці не.

— Калі мы думаем пра будучыню, нам патрэбны інвестыцыі — новая тэхніка, інфармацыйныя тэхналогіі, — кажа Мікалай Баравы. — Доля рухомага саставу, які мае ўзрост ад 3 да 7 гадоў, значна вырасла. Машын узростам ад 1 да 3 гадоў мы маем толькі 12%. А пажадана было б мець гэтую долю мінімум 40% рухомага саставу. Нам для абнаўлення рухомага саставу патрэбны вялізныя грошы, я нават не хачу называць суму. І мы вымушаны сёлета прыпыніць шмат якія кантракты, звязаныя з абнаўленнем рухомага саставу. А яны былі накіраваны на тое, каб нагнаць учарашні дзень, не кажучы ўжо пра сённяшні і пра будучую працу, — сказаў Мікалай Баравы і патлумачыў, што старыя аўтамабілі, у сваю чаргу, прыводзяць да большых выдаткаў. — Сёння, напрыклад, мы плацім за выкарыстанне дарожнай інфраструктуры (аўтабана) Германіі на аўтамабілях ЕЎРА-3 ці ЕЎРА-4 дарожныя зборы, павышаныя на 20-25%. Так што калі мы не абнаўляемся, то атрымліваем зусім іншыя выдаткі, і нас, з пункту гледжання канкурэнцыі, падвядуць так, што мы вымушаны будзем гэтыя рынкі пакідаць, бо пры старой тэхніцы ў нас не хопіць нашай даходнай часткі і рэнтабельнасці, каб закрыць гэтыя выдаткі. Зараз быццам мы і прыбытак нейкі атрымліваем. Але калі яго скласці, то хопіць на набыццё толькі сотні аўтамабіляў. А нам трэба хоць бы за год пад сённяшні парк мець 1,5 тысячы аўтамабіляў абнаўлення.

### Паражняком машыны ніхто не ганяе

Журналісты пацікавіліся, ці могуць пацвердзіць міжнародныя аўтамабільныя перавозчыкі той факт, што з-за абмежавання імпарту з-за мяжы машыны вяртаюцца пустыя?

— Мы туды і назад ходзім з грузам. Ніхто з маіх калег не выходзіць з Еўропы без грузу, гэта нонсенс, — адказаў **Андрэй ЗЫРАНАЎ, старшыня праўлення ААТ ТЭП «Белгрузаўтатранс»**. — Каэфіцыент выкарыстання прабегу сёння 0,87 — гэта значыць, што на 100 км прыходзіцца 13 парожніх (як удакладніў Мікалай Баравы, у цэлым па рэспубліцы гэты паказчык 0,8, а ў ідэале ён павінен быць 0,95). Што тычыцца росту тарыфаў на міжнародныя перавозкі, то ён ёсць, але ён сінусаідальны: спачатку ідзе рост, а потым падзенне. Чаму ў сённяшняй сітуацыі падраслі тарыфы? Вырас сабекошт, падаражэла паліва ў нас, у Расіі і ў Еўропе. Плюс яшчэ іншыя складнікі сабекошту, якія і вымушаюць тарыф пасоўваць. Але гэта нармальнае сезоннае павышэнне, потым будзе сезоннае паніжэнне.

— Сапраўды, можа, у кагосьці такая праблема ўзнікла. Бо, здаецца, лагічна атрымліваецца: кажаш перавозчыку: «Завязі экспарт», а ён адказвае, што загрузіцца ў зваротным кірунку няма чым, таму давай іншую цану на перавозку. Магчыма, недзе такія пытанні і ўзнікаюць. Але калі браць працу міжнароднага аўтамабільнага транспарту ў цэлым, то мы за тое, каб перавозка не была парожняй, абслугоўваем рынкі трэціх краін, перакідваем транспарт на іншыя напрамкі, — патлумачыў Мікалай Баравы.

Дарэчы, у некаторых прадпрыемстваў, што падпарадкоўваюцца Мінтрансу, развіццё абмяжоўваюць і даведзеныя паказчыкі:

— Наша арганізацыя працуе некалькі ў іншых умовах, бо мы ўваходзім у склад Мінтранса і маем пэўныя ўмовы і рамкі, — расказвае **генеральны дырэктар ААТ «Белмагістральаўтатранс» Мікалай ГОРБЕЛЬ**. — Вось адзін з прыкладаў дзяржаўнага рэгулявання міжнародных перавозак: з аднаго боку, «Белмагістральаўтатранс» мае заданне па інвестыцыях у асноўны капітал (у тым ліку і замежных), а з іншага боку, ёсць заданне па імпарце тавараў. Асноўныя інвестыцыі — гэта, вядома, рухомы састаў. Такім чынам мы маем два паказчыкі, якія адзін аднаму супярэчаць. Напрыклад, на гэты год мы маем заданне па імпарце тавараў на 1,2 мільёна долараў і не можам гэтую лічбу перавысіць. А станцыя «Вольва», якая сёння працуе, за год спажывае каля 1 мільёна долараў імпарту. Застаецца 200 тысяч, якія зусім нішто для набыцця рухомага саставу. І мы зараз ламаем галаву — і як выканаць замежныя інвестыцыі, і як не перавысіць заданне па імпарце тавараў...

### У краіне не хапае 1,5 тысячы дальнабойшчыкаў?

Мікалай Горбель узняў таксама тэму недахопу прафесійных кіроўцаў, якія маглі б ажыццяўляць далёкія рэйсы:

— Сёння існуе дэфіцыт вадзіцельскага саставу. Трэба, напэўна, ужо ў сярэднюю школу прыходзіць і там расказваць пра прафесію кіроўцы. Той, хто даўно працуе ў міжнародных перавозках, памятае, што раней толькі праз абкам партыі кіроўца мог патрапіць на міжнародныя перавозкі. А сёння мы навучыліся набываць сучасны рухомы састаў, але ўпусцілі момант адукацыі рэзерву кіроўцаў для гэтага рухомага саставу. Мае калегі адчуваюць сапраўдны дэфіцыт кадраў — асабліва няма кіроўцаў у Гродзенскім рэгіёне, Гомельскай вобласці, складана з імі і ў Брэсце.

Недахоп кіроўцаў-дальнабойшчыкаў **Віктар БЛАЖУКЕВІЧ, дырэктар СТАА «М & М Мілітцэр & Мюнх»**, ацэньвае ў 1,5 тысячы чалавек:

— Гэта вялікая колькасць, і таму перад намі важная сацыяльная задача. Шмат транспарту прастойвае без кіроўцаў, і такім чынам мы губляем вялізны аб'ём экспартнай выручкі...

Разам з тым, нягледзячы на ўсе цяжкасці, міжнародныя аўтамабільныя перавозчыкі аптымізму не губляюць і нават замахваюцца на рынкі іншых краін:

— Калі глядзець на нашу галіну і на наш транспартны бізнэс, то я лічу, што ўчарашнія, сённяшнія і будучыя поспехі магчымыя дзякуючы вельмі вялікай канкурэнцыі ў галіне, — лічыць **Уладзімір ГУРЫНОВІЧ, заснавальнік СП ТАА «Джэнці Спедзішн»**. — Калі б яе не было — мы б пажыналі іншыя плады. Таксама я бачу ў гэтым поспеху тое, што дзяржава нам не замінала, — гэта вельмі важна. А дзякуючы БАМАП нас нават слухалі. І па-трэцяе, наша галіна на сёння з'яўляецца найбольш празрыстай: калі б бізнэс не быў празрыстым, ніводны банк не даў бы нам гэтых інвестыцый і грошай. Дзякуючы Мытнаму саюзу і Адзінай эканамічнай прасторы, якая будзе, мы маглі б працаваць лепш — мы павінны забраць частку працы ў калег з Польшчы і Прыбалтыкі. Калі мы гэта зможам зрабіць, то, паверце, нашая выручка вырасце ў 2-3 разы.

**Павел БЕРАСНЕЎ.**

Зачапіла!

# ЗАПРАВІЦЦА Б НА ЎСЁ ЖЫЦЦЁ, АЛЕ...



Фота зроблена на аўтазапраўцы «Белнафтахім» на вуліцы Магілёўскай у Мінску.

БЕНЗІН і дызпаліва на аўтазапраўках, як і любы тавар, могуць аднойчы заканчвацца альбо даражэць. Не толькі ў нас — у любой краіне. І, як правіла, гэта здараецца ў самы непадыходзячы для гаспадара аўто час: альбо ў тваім жалезным коніку поўны бак, альбо ў кашальку гуляе вецер. Ці, што самае крыўднае, і грошай хапае, але «конь» на рамонце. І тады ты «пралятаеш», бо не можаш, як іншыя, узяць у запас. А хацеў бы. Нават на ўсё жыццё.

Пазаўчора на запраўках магла быць самая звычайная штодзённая абстаноўка. Каб загадзя не аб'явілі пра падаражэнне паліва. Але паведамілі. І сталіца сарвалася. Здаецца, увесь Мінск кінуўся на запраўкі, якіх цяпер, дзякуй Богу, хапае. Кіламетровых чэргаў я не бачыў, але метраў па дзвесце ўтвараліся. Маё аўто на хаду і грошы яшчэ не звяліся, таму і я адстаяў з добрую гадзіну, якую мог патраціць на творчыя ці хатнія справы. Нерваваўся, баяўся, што не хопіць саляркі. Гэтак хацелася каб бак быў паўнюткі, быццам апошні раз запраўляешся і нібыта на ўсё жыццё. Чым бліжэй быў да бензакалонкі, тым мацней білася сэрца.

Раніцай мяне здзівіў сябар, які паведаміў, што праігнараваў падаражанне паліва. Ён зрабіў вывад, што губляць час і псаваць нервы куды даражэй, чым эканоміць на розніцы цэн. А на ўсё жыццё ўсё роўна не заправішся. Нягледзячы, на тое што ягоны «сітраен» даволі эканамічны і ездзіць ён не так шмат...

**Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.**


**ИНФОРМАЦИЯ**
**об открытом акционерном обществе, акции которого предлагаются гражданам для обмена на именные приватизационные чеки «Имущество» через обособленные подразделения АСБ «Беларусбанк»**

| № п.п. | Наименование открытого акционерного общества, адрес | Уставный фонд акций, штук | Доля государства в уставном фонде (%) | Номинальная стоимость 1 акциии в рублях | Стоимость акции в чеках (чек/акция) | Количество акций, предлагаемых для обмена | Предмет деятельности открытого акционерного общества |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 |
| 1. | Открытое акционерное общество «Трест Белтрансстрой» 220050 г.Минск, ул.Советская,8 | 8614477 | 99.9 | 4400 | 1/1 | 43070 | Проектирование и строительство зданий и сооружений |

**Примечание:**

1. Оформление документов для обмена чеков на акции производится в обособленных подразделениях АСБ «Беларусбанк» по местожительству граждан.

2. Срок обмена – с 1 июня 2011 года по 30 июня 2013 года.

3. Для обмена на акции приватизируемых предприятий принимаются чеки, начисленные гражданам, полученные по договорам дарения и (или) по наследству от близких родственников (родителей, детей, супругов, родных братьев и сестер, внуков, бабушек, дедушек, свекрови, свекра, тестя и тещи), но в сумме не более 250 чеков.



**МОГИЛЕВСКИЙ ГОРИСПОЛКОМ СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА В Г.МОГИЛЕВЕ**
**Аукцион состоится 24 июня 2011 года в 16.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, зал заседаний**

| № лота | Адрес земельного участка | Площадь, га | Срок аренды | Цель использования, условия продажи | Кадастровый номер | Стоимость землеустроительного дела (руб.) | Начальная цена (руб.) | Сумма задатка (руб.) |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| № 1 | переулок Западный, район жилого дома № 7 (ограничения – р. Днепр) | 0,0040 | 1 год | установка и обслуживание торгового павильона | 740100000003006020 | 1 287 516 | 252 000 | 23 000 |

Принимать участие в аукционе могут юридические лица, индивидуальные предприниматели и граждане (в соответствии с законодательством).

При оформлении заявления и соглашения о правах и обязанностях сторон желающие принять участие в аукционе представляют:

Заверенную копию платежного поручения о внесении задатка на расчетный счет Могилевского городского исполнительного комитета № 3641017440554 в филиале 700 МОУ ОАО «СБ «Беларусбанк», код 536, УНП 700123787 (разовый платеж);

Юридические лица: доверенность, выданную юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица; копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица; документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

Индивидуальные предприниматели: копию свидетельства о государственной регистрации; копию паспорта, а в случае участия в аукционе представителя – копию паспорта и нотариально удостоверенную доверенность;

Граждане – копию паспорта, а в случае участия в аукционе представителя – копию паспорта и нотариально удостоверенную доверенность.

1) Условия инженерного развития инфраструктуры: земельный участок расположен на застроенной территории, в непосредственной близости имеются инженерные коммуникации.

2) Условие проведения аукциона – наличие не менее двух участников.

3) Условие предоставления земельного участка в аренду: согласование типа павильона с управлением архитектуры и градостроительства Могилевского горисполкома.

4) Порядок осмотра на местности земельного участка: выезд по желанию, предварительное ознакомление с земельно-кадастровой документацией всем желающим.

5) В течение 10 рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении в аренду земельного участка победителю аукциона оплатить стоимость предмета аукциона, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, и выполнить условия, предусмотренные в решениях об изъятии земельных участков для проведения аукциона. Ориентировочная сумма затрат на организацию и проведение аукциона составляет 6 миллионов рублей.

Заявления и документы принимаются уполномоченной организацией (МГУКПП «Проектное специализированное бюро») по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, каб. 206 в рабочие дни с 8.00 до 17.00. Последний день приема заявлений – 20.06.2011 года до 17.00.

**Контактный телефон в г. Могилеве 22 11 63.**


# ШАШКІ

*Пад рэдакцыяй майстра спорту Мікалая ГРУШЭЎСКАГА*

### УПЕРШЫНЮ Ў ГІСТОРЫІ

У вышэйшай лізе чэмпіянату Беларусі па шашках-100 адбылася сапраўдная сенсацыя: упершыню жанчына стала чэмпіёнкай краіны... сярод мужчын (!). Перамогу ў ім святкавала мінчанка Вольга Федаровіч, мацнейшая ў свеце юная шашыстка, якая двойчы перамагала ў жаночых першынствах рэспублікі. У яе выйграў толькі міжнародны майстар Андрэй Толчыкаў з Гомеля. Ён набраў такую ж колькасць ачкоў, як і Вольга (13), але па дадатковых паказчыках яму ўручаны сярэбраны медаль. Сталічныя міжнародныя гросмайстры Аляксандр Булатаў, Яўген Ватуцін і Сяргей Насевіч занялі трэцяе, чацвёртае і пятае месцы адпаведна.

Намеснік старшыні БФШ Віталь Варушыла перадаў па электроннай пошце прыклад гульні чэмпіёнкі:

**Белыя** (Я. Ватуцін): 26, 27, 28, 30, 32, 33, 35, 37, 38, 39, 40, 41, 42, 43, 44, 45, 49 (17). **Чорныя** (В. Федаровіч): 3, 4, 6, 7, 8, 9, 10, 11, 13, 15, 16, 17, 18, 19, 21, 23, 24 (17). Тут чорныя правялі ўдар «рыкашэт». Зрабіце гэта і вы ў рамках нашага бліца-61/4.

### «ПАГОДА Ў ДОМЕ»-8

Кваліфікаваны конкурс рашэнняў шашачных пазіцый на прызы калектыву Свіслацкага прадпрыемства жыллёва-камунальнай гаспадаркі (кіраўнік Канстанцін Міхайлавіч БАРЭЛЬ) працягваецца заданнем № 4:



**Белыя:** e3, e5, h2, h4, h6 (5). **Чорныя:** c5, e7, f6, f8, g7 (5). Выйгрыш.

### «БЕЛАРУСЬ-2010»

Пад такой назвай газетай «Культура» сумесна з БФШ быў праведзены міжнародны конкурс па шашачнай кампазіцыі. Ён зацікавіў не толькі айчынных, але і замежных складальнікаў. Іх задумкі разгледзелі суддзі І. Івацка (Украіна), В. Студзянцоў і В. Бляўскас (Літва), М. Грушэўскі і П. Шклудаў (Беларусь) і выявілі лаўрэатаў. У катэгорыі В (праблемы-100) імі сталі М. Цветаў (Ізраіль), Р. Шаяхметаў і У. Матус (Расія), П. Шклудаў і М. Грушэўскі, катэгорыі С (дамачныя праблемы-100) — В. Бляўскас, І. Івацка і М. Цветаў. Яны атрымалі балы для прысваення ім міжнародных званняў.

### АЎТАРСКІ-13/19

У якасці чарговага задання гросмайстар СССР Леанід Вітошкін (Гомель) прапануе свой новы эцюд:



**Белыя:** e3, e7, f2, дамка d6 (4). **Чорныя:** a3, h4, дамка g1 (3). Перавага белых.

* * *

Тэрмін для адказаў традыцыйны — два тыдні. Накіроўвайце іх на адрас: **220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а, рэдакцыя газеты «Звязда», рубрыка «Шашкі».**

### РАШЭННІ

Калі ласка, праверце свае рашэнні ранейшых заданняў.

**Бліц-61/1** (М. Баброўнік): A(30) 25, 22-18, 43, 32, 25-20, 34, 8, 38, 11, 17#.

**Аўтарскія:** 13/15 (Л. Вітошкін). d6, g7, e7, b8, b4, g7 (d4) h8 (e3) c3 (f2) d4 (e1) f2, f4x і **14/9** (В. Шульга). 3, 25, 22, 24-20 (35:24 **A**) 29, 3, 25x. **A**(15:24) 19, 48, 39, 50x.


**Дополнение к проектной декларации объекта долевого строительства, опубликованного в газете «Звязда» № 88 от 14 мая 2011 года.**

С 25.05.2011 года цена 1 кв. метра площади по СНБ 3.02.04-03 на дату опубликования настоящей проектной декларации для физических лиц, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий с использованием льготных кредитов, – 4 990 000 бел. рублей, без льготных кредитов – 5 360 000 бел. рублей.

Для физических лиц, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, юридических лиц и индивидуальных предпринимателей – 5 690 000 – 6 090 000 бел. рублей.

ОАО «Белбуд»

*УНП 100794022*

